Пралетарыі усіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 КАП.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Калькарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 90 к. • 3 • 2 р. 70 к. • 6 • 4 р. — к. • 1 год 8 р. — к. Зьмена адрасу: Іншагародніх — 20 к. Мясцовых — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок капіталы пасьля тэксту — р. 50 к. За радок капіталы насярэдзіне тэксту 1 р. — к. За радок капіталы перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпецыяльныя на 50 проц. дарожэй. Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 квадратны . . 35 кап. За кожны дадатковы . . 15 • Беспрацоўных і чырвонаармейцаў за квадратны . . 15 • За кожны дадатковы . . 5 • Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА у канторы газеты, на ўсіх аддзяленьнях Белдэрпошты і Белдорпошты і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АББЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газеты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 41 (2229) Пятніца, 17-га лютага 1923 г.

На парозе другога дзесяцігодзьдзя

Да юбілею Чырвонай арміі засталося крыху больш тыдню. Ва ўсіх акругах, ва ўсіх раёнах, ва ўсіх чырвонаармейскіх часьцях Беларускага Ваеннага Вокругу вядзецца ўзмоцненая падрыхтоўка да сьвяткаваньня гэтага гістарычнага юбілею.

Юбілей Чырвонай арміі зьяўляецца юбілеем усіх працоўных масаў нашай рэспублікі таму, што наша армія шчыльна зьвязана са ўсімі рабочымі і сялянамі, што наша краіна паслала ў армію сваіх лепшых сыноў, каб яны абаранялі яе спакой, каб даць магчымасьць мірна працягваць нашае сацыялістычнае будаўніцтва. Вось чаму наш урад увесь час клапоціцца аб дабрабыце Чырвонай арміі і аб тых камандзірах і чырвонаармейцах, якія пасьля пэўнага тэрміну варочаюцца з Чырвонай арміі на мірную працу. Цэлы шэраг законаў Усесаюзнага і Беларускага ўрадаў прадугледжваюць тыя льготы, якія мы даём дэмабілізаваным чырвонаармейцам і камандзірам.

Падрыхтоўка да юбілею Чырвонай арміі павінна высьветліць, як ажыцьцяўляюцца гэтыя законы ўраду, як спраўды нашы органы на мясцох забясьпечваюць працай дэмабілізаваных камандзіраў і чырвонаармейцаў, як на справе даюцца тыя ці іншыя льготы, прадугледжаныя законам для сем'яў чырвонаармейцаў.

Пастанова ЦВК БССР, якая сёньня друкуецца ў нашай газэце, прадпісвае ўсім дзяржаўным органам асабліва ўважліва прагледзіць, як гэтыя выконваюцца. Да 23 лютага гадовага юбілею Чырвонай арміі на быць зьнішчана беспрацоўнасьць дэмабілізаванага начальніцкага складу Чырвонай арміі. Да гэтага часу мясцовыя савецкія органы поўнасьцю не выканалі пастановы ўраду па гэтым пытаньню. Зараз, сьвяткуючы гадовы юбілей Чырвонай арміі, мы павінны паклапаціцца аб тым, каб яна было ніводнага беспрацоўнага камандзіра, каб кожны камандзір Чырвонай арміі ведаў аб тым, што пасьля дэмабілізацыі дзяржава яго не пакіне бяз увагі, што яму ў першую чаргу будзе дадзена магчымасьць выкарыстаць свае веды і энэргію ў нашых грамадзянскіх установах.

У нашых беларускіх умовах мы, рыхтуючыся да 10-годзьдзя Чырвонай арміі, павінны зьвярнуць увагу на адно з буйнейшых дасягненьняў — тэрытарыяльна-міліцыйную сыстэму нашага армейскага будаўніцтва. Палягчаючы працоўнаму насельніцтву перанесьці тыя перашкоды, якія выклікаюцца ў кожнай гаспадарцы ў зьвязку з прызывам у армію, і скарачаючы выдаткі дзяржавы на ўтрыманьне арміі, тэрытарыяльная сыстэма ў гэты самы час набліжае ваеннае навучаньне да фабрыкі, вёскі, школы. Тэрытарыяльныя часьці найлепшым чынам ажыцьцяўляюць сувязь Чырвонай арміі з працоўным насельніцтвам. Ваенная праца ў часе збораў і паміж зборамі ўвязваецца з культурна-асьветнай працай у рабочых клюбах, лепінскіх куткох, хатах-чытальнях.

Важнае значэньне ў справе будаўніцтва Чырвонай арміі маюць нашы нацыянальныя фарміраваньні. Камуністычная партыя і савецкая ўлада, ажыцьцяўляючы агульныя прынцыпы сваёй нацыянальнай палітыкі, распаўсюджваюць яе і па Чырвоную армію. Мы ў час, па Беларусі, маем буйныя вайсковыя адзінкі, якія пераважную частку сваёй працы вядуць на беларускай мове. Гэта яшчэ больш набліжае Чырвоную армію да працоўных гушчаў нашае краіны.

Сьвяткуючы дзесяцігодзьдзе Чырвонай арміі, мы павінны таксама праверыць тыя посьпехі і недахваты, якія маюць нашыя беларускія дывізіі ў сваёй працы, як пасьпешна яны беларусізуюцца і ажыцьцяўляюць нацыянальную палітыку нашай партыі і савецкай улады.

Даць адпор нацыянал-шавіністам у КП Заходняй Украіны.

Выканком Камінтэрну кліча ўсіх членаў КПЗУ і ўсіх працоўных байнатаваць прыхвасьняў украінскае буржуазіі.

МАСКВА, 15-II. У польскай і украінскай камуністычнай прэсе, якая нелегальна выдаецца ў Польшчы, зьмешчана адозва выканкому Камінтэрну да ўсіх партыйных арганізацый і да ўсіх сабраў кампартыі Заходняй Украіны.

Адозва накіравана проці былога кіруючае групы КПЗУ (камуністычнае партыі Заходняе Украіны), якая выступала летась са абгаворку нацыяналістычнага ўхілу ўнутры КПЗУ.

Адозва адзначае, што „група сабраў ЦК КПЗУ, цалкам падпаўшая пад уплыў дробна-буржуазнага нацыяналізму, пайшла на шляху расколу КПЗУ і расколу рэвалюцыйнага руху працоўных мас Заходняе Украіны, што гэтая група намыкаецца перашкодзіць сувязь між рэвалюцыйным рухам Заходняе Украіны і рэвалюцыйным рухам Польшчы і Заходняе Беларусі, што, не прызнаючы сваіх нацыяналістычных памылак, гэтая група сьледам за буржуазнымі групоўкамі Заходняе Украіны выступае проці Савецкае Украіны, якая будуе сацыялізм і вызваляе украінскія працоўныя масы ад векавога нацыянальнага прыгнечаньня».

Перад тварам усяе партыі і ўсімі працоўнымі масамі Украіны выканком Камінтэрну выкрывае і ганьбіць былую кіруючую групу ЦК КПЗУ, як групу антыкамінтэрнаўскую і фактычна антысавецкую, прапаную перавесьці з яе ўсякія сувязі і заклікае партыйныя арганізацыі і рэвалюцыйныя масы Заходняе Украіны даваць поўнае і рашучае падтрыманьне ЦК КПЗУ, які абапіраецца на пераважаючую большасьць мясцовых арганізацый партыі і працуе ў шчырым кантакце і пад кіраўніцтвам ЦК КП Польшчы і Камінтэрну.

ВІЛЕНСКАЕ ПЫТАНЬНЕ ЗНОЎ НАПАВЕРХНІ

РАЗВАЖАНЬНІ «ТАНА» АБ ПРЫЧЫНАХ ЗЬЯЎЛЕНЬНЯ НОТЫ ЗАЛЕСКАГА.

ПАРЫЖ, 15-2. «Тан» (орган францускага міністэрства зам. спраў) зьмясьціла карэспандэнцыю з Варшавы, у якой абмяркоўваецца апошняя польская нота Літэ.

Зазначыўшы, што Вальдэмарас сыстэматычна ўхіляецца ад перамоў з Польшчаю, газэта піша: «Тыя з суседзяў Літвы, хто любіць лавіць рыбу ў каламутнай вадзе, карыстаюцца гэтымі настроямі. Масква зьвярнулася да Вальдэмараса з вотаю, зьмест якое невядомы, але варожы Лізе Нацый характар гэтае ноты бясспрэчны. З другога боку, Вальдэмарас у часе свайго знаходжаньня пабыту ў Берліне, як відаць, ня выкарыстаў мудрых парад Штрэзэмана і паслухаўся абяцанак сваіх старых берлінскіх прыяцеляў, якія шукаюць у ускладненьнях магчымасьці рэваншу. Вось чаму імкненьне пазбавіць раду Лігі Нацый ад удару па яе прэстыжу і прымусіла Залескага паскорыць ход падзей. Залескі рашыў прыехаць у Жэневу, маючы магчымасьць паведаміць пра посьпех пачатку ажыцьцяўленьня рэвалюцыі ад 10-га сьнежня, або мець бясспрэчны доказ літоўскае адмовы, каб выступць перад радаю Лігі патрабаваньне, каб яна ізноў фармальна ўмяшалася ў канфлікт».

ГРЭЦЫЯ НА ВАЕННЫМ СТАНОВІШЧЫ.

ВЕНА, 15-2. Водлуг паведамленьня з Афін, грэцкі ўрад абвясьціў ваеннае становішча, нібыта з прычыны небясьпекі „паўстаньня". Былі ўжыты надзвычайна суровыя паліцэйскія меры. На выспу Крыт, дзе рэвалюцыйны рух набыў асабліва вострую форму, паслана новае войска.

Палітычны крызіс у Нямеччыне.

БЭРЛІН, 15-II. Міжфракцыйны камітэт урадавых партый прыйшоў да выводу сёньня, што перамовы аб кампрамісным упарадкаваньні пытаньня аб школьным законе не дадуць пазітыўных вынікаў. Урадавы крызіс уваходзіць у рашаючую базу. Канцлер Маркс паведаміў Гіндэнбурга аб абцяжараным становішчы.

Францускі парлямант падтрымлівае эксплёататараў.

ПАРЫЖ, 15-II. Палата адхіліла тэрміновасьць пытаньня аб зачыненьні вугольных капальняў, у Лявавэй. Пытаньне падаў камуністычны дэпутат Карнавэн, які зазначыў—што звыш 500 сем'яў прымушаны эміграваць, а таксама адхіляў заявленьне вугольнае кампаніі ад стратнасьці прадпрыёмства. Карнавэн вымагаў, у выпадку ўпартасьці кампаніі, нацыяналізаваць капальні.

ВЫКІНУТЫ НА ВУЛІЦУ.

ПАРЫЖ, 15-II. Прыехаўшага ў Ліможж міністра грамадзкае працы Тард'е наведала дэлегацыя горнарабочых, якая пратэставала проці зачыненьня Лявавэйскіх капальняў. Міністр адказаў, што далейшая эксплёатацыя капальняў немагчыма.

АСТРОЖНЫЯ ПРЫСУДЫ КАМУНІСТАМ.

ПАРЫЖ, 15-II. Булёнскі суд засудзіў камуністаў Дуклё і Лефэўра—першага да 2-х гадоў астрогу і 3-х тысяч франкаў штрафу, другога да 3-х месяцаў астрогу і 1.000 франкаў штрафу за распаўсюджаньне сярод салдат органу францускае кампартыі „Казарма".

СССР і капіталістычны сьвет.

ПЕРАКЛІЧКА З СССР ПРАЗ ГАЛОВЫ СІТРЫНА І К-О.

ЛЁНДАН, 7-2. Скліканая па ініцыятыве рады прафсаюзаў у Кавэнтры канфэрэнцыя прадстаўнікоў мясцовых арганізацый прафсаюзаў, рабочае партыі і кааперацыйнае партыі пастанавіла заснаваць камітэт прыцеляў СССР. Канфэрэнцыя аднагодна ўхвалила рэзалюцыю, у якой ганьбіць генэральную раду за зрыў англа-расейскага камітэту адзінства і прапануе генэральнай радзе ўжыць усе захады да яго аднаўленьня.

ЗАПЫТАНЬНІ Ў АНГЕЛЬСКІМ ПАРЛЯМАНЦЕ АБ АДНОСІНАХ ДА СССР.

ЛЁНДАН, 15-2. У палаце вобшчын камуніст Сакдатвала задаў міністру замежных спраў запытаньне, ці відома яму, што СССР пасылае дэлегата ў Жэневу для прысутнасьці на сэсіі камісіі аб безапаснасьці. Таварыш міністра замежных спраў Лёкар Лемпсон адказаў: мне вядома, што савецкі ўрад не пажадаў быць прадстаўленым у камісіі па безапаснасьці, але заявіў аб сваіх намерах паслаць у камісію наглядчыка.

Сябра рабочае партыі Хейс задаў запытаньне міністру замежных спраў, ці вядома яму, што ангельскія рыбалоўныя судны церпяць страты з прычыны таго, што яны не заходзяць у савецкія воды, і ці не абмяркуе ўрад пытаньне аб аднаўленьні гандлёвых зносін з СССР. Лёкер Лемпсон адказаў: «Чэмбарлену вядома гэта, але ён ня можа ўзяць на сябе адказнасьць, каб падахвочваць ангельскае рыбалоўства ў водах, дзе ангельскі ўрад ня можа даць абароны, якая можа быць ім патрэбнаю. Што-ж датычыць другое часткі пытаньня, дык я павінен падкрэсьліць, што нашыя гандлёвыя зносіны з СССР не патрабуюць аднаўленьня, бо яны ніколі не парываліся. Умовы-ж, якія дазволілі-б аднавіць дыпляматычныя зносіны, былі ўжо апавешчаны ў палаце вобшчын, але такіх умоў зараз няма».

ІМКНЕНЬНЕ ПЕКІНА ЎЛАДЗІЦЬ УЗАЕМААДНОСІНЫ З СССР.

ПЕКІН, 13-II. Зазначаючы на посьпех місіі віконта Гото ў СССР, газэта „Чэн-Бао" заяўляе, што Кітай павінен узяць пад увагу гэтыя абставіны і зьмяніць свае адносіны да СССР.

Спасылаючыся на заяву віконта Гото, што савецкі ўрад не адказвае за камуністычную прапаганду ў Кітаі, газэта піша: «СССР, як відаць, хацеў паведаміць нас праз пасрэдніцтва віконта Гото пра свае шчырае жаданьне імкнуцца да прыязьні з Кітаем і выправіць свае памылкі. Калі гэта так, дык мы вітаем такія намеры Расеі. Мы не павінны зварачваць увагі на палітыку ўраду на поўдні Кітаю; у кожным разе пекінскі ўрад не павінен ісьці па прыкладзе паўднёвага ўраду, бо пекінскі ўрад зьяўляецца цэнтральным урадам Кітаю і, у моц гэтага, павінен мець выразна акрэсьленую замежную палітыку».

Камуністычны рух у Гуандуні.

ХАЙКОЎСКІ РАЙЁН САВЕЦКАГА КІТАЮ.

ШАНХАЙ, 15-2. З Ганконгу паведамляецца, што цэнтрам камуністычнага руху ў Гуандуньскай правінцыі зьяўляецца Хайкоў. На ўсіх грамадзкіх памяшканьнях гораду ўзьняты чырвоныя с цягі. Рабочыя Хайкоў арганізавалі «трэц атрад чырвонае гвардыі Хайкоўскага райёну савецкага Кітаю» лікам у 1000 чал.

КАМУНІСТЫЧНАЕ ПАЎСТАНЬНЕ ШЫРЫЦЦА.

ТОКІЁ, 15-2. Газэта „Ніцы Ніцы" паведамляе, што Кайфыньскі і Піфыньскі паветы ў правінцыі Гуандунь, як і раней, ахоплены паўстаньнем. Газэта абурана проці гвалтаў, якія, нібыта, учыняюць у гэтых паветах рэвалюцыйныя атрады пад кіраўніцтвам камуністаў. Для прыдушэньня паўстаньня ў Сватоу прыехаў атрад войска.

ПАДПОЛЬНАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ КАМПАРТЫІ.

ПЕКІН, 10-II. Агенцтва Тохо паведамляе, нібы ў апошніх лічбах студзеня ў Шанхаі адбывалася падпольная канфэрэнцыя кітайскае кампартыі з удзелам 52 дэлегатаў.

НЯТРЫВАЛАСЬЦЬ ПАЎДНЁВАГА КОНТР-РЭВАЛЮЦЫЙНАГА ЎРАДУ.

ПЕКІН, 15-II. „Норд Чайна Стандарт" агалашае ўражаньні францускага пасланьніка ў Пекіне Мартэльма аб яго падарожжы па поўдзень. Водгук слоў Мартэльма, у бліжэйшай будучыні нельга чакаць аб'яднаньня паўднёвых груповак; таксама няма даных, якія сьведчылі-б аб умацаваньні гуансійскае, панкінскае ці ўханскае груповак. Палітычную дзейнасьць Гамідану абмяжоўвае ваенная актыўнасьць генэралаў. Камуністы насяліліся ў вёсках і невялікіх гарадох і толькі чакаюць выгоднага моманту, каб ажывіць сваю дзейнасьць.

У канцы Мартэльм зазначае, што на поўдні няма грошай, і таму вакатурныя групоўкі сільным зьвяцца на кампраміс.

ВЫКРЫТЫ ПРАВАКАТАР.

ХАРБІН, 14-II. 10 лютага ў савецкае консульства ў Харбіне зьявіўся нейкі Шышкін, які назваў сябе сакрэтным супрацоўнікам паліцэйскае ўправы асобнага райёну 3-х усходніх правінцый. Шышкін заявіў, што амаль усе сакрэтныя дакументы паліцыі, між іншым, датычныя нагляду за асобамі, западазронымі ў спачуваньні бальшавізму, праходзяць праз яго. Для доказу Шышкін падаў шмат дакумантаў з рэвалюцыямі начальніка паліцыі: «На выкананьне Шышкіну». Сярод папер, пададзеных Шышкіным, знаходзіўся відочна выдуманы даклад аб тым, што ў габінэце кіраўніка Кітайска-Усходняе чыгункі нібы маецца склад зброі, і што гэткія склады зброі маюцца і ў іншых мясцовасьцях райёну 3-х усходніх правінцый. Шышкін далей расказаў аб існаваньні ў Харбіне саюзу тэрарыстаў у ліку 19 асоб, які намераны зьнішчыць асобных савецкіх працаўнікоў. Шышкін ня раз падкрэсьліваў, што ён можа здабыць патрэбныя савецкаму консульству весткі і выканаць усякае іншае даручэньне, але, відома, за пэўную ўзнагароду, бо гэтага патрабуе яго матар'яльнае становішча.

11 лютага Шышкін ізноў прыйшоў у савецкае консульства і прапановаў свае паслугі. Консульства пасылкала выклікала прадстаўніка паліцэйскае ўправы, які арыштаваў Шышкіна. У часе обыску ў Шышкіна знайшлі рэвальвэр і дакументы, якія ён падаваў сэкратару консульства.

Шышкін пры арышце заявіў, што ён—савецкі грамадзянін. Водлуг наведзеных даведак—ён ранейшы калчакоўскі афіцэр. Яму пасьля ўмацаваньня савецкае ўлады ў Прыморры ўдалося прымазацца да розных савецкіх арганізацый, і ён у свой час займаў розныя пасады. У Харбіне Шышкіну ўдалося праладзіці на працу ў раду прафсаюзаў, якая знаходзілася на нэлегальным становішчы. Ён аказаўся правакатарам. Некалькі месяцаў назад водгук яго даносаў адбываліся масавыя арышты і вобыскі.

Камуністычны рух у Германіі.

РАЗВАЛ ПРОЦІ ІТАЛЬЯНСКІХ КАМУНІСТАЎ.

РЫМ, 15-2. У зьвязку з распаўсюджаньнем камуністычнае адозвы ў Б'елі, там былі ўчынены арышты. Пасьля таго, як гэтая адозва была параклейвана, учынены новыя арышты. Апроч таго, 8 чалавек прыцягнута да адказнасьці за аднаўленьне распушчанае арганізацыі камуністычнае моладзі.

АСТРОЖНЫЯ ПРЫСУДЫ.

РЫМ, 15-2. Надзвычайны трыбунал у Падуі засудзіў 7 камуністаў да зьняволеньня на тэрміны ад 14-ці да 5-ці гадоў.

ПЕРАДАЧА ВЯРЫЦЕЛЬНЫХ ГРАМАТ ТАВ. КУРСКІМ.

РЫМ, 15-2. Новы пасол СССР у Рыме Курскі наведаўся да караля і перадаў яму свае вярыцельныя граматы.

Фашысцкія змовы ў Латвіі.

РЫГА, 15-II. Газэта «Сацыял-Дэмакрат» паведамляе: справа Ікшы, які падрыхтоўваў скасаваньне сацыял-дэмакратычнага ўраду Скуэнка, пашыраецца. За Ікшаю стаіць шматлікая група афіцэраў, належачых да гарнізонаў Мітавы, Дзьвінску і інш. гарадоў. Ёсьць меркаваньні лічыць, што тайная афіцэрская арганізацыя існуе і да гэтага часу.

Ген. Радінш падаецца ў адстаўку.

Латвійская прэса паведамляе, што камандуючы арміяй ген. Радзіньш, які нядаўна атрымаў доўгатэрміновы водпуск—у сувязі з справай афіцэра Ікшы, падрыхтоўваўшага замах на сацыял-дэмакратычны ўрад Латвіі, настолькі сур'ёзна захваробу, што пастанавіў пакінуць пасаду камандуючага арміяй.

СССР і Літва.

Заява літоўскага пасланьніка ў Маскве.

МАСКВА, 15-2. 16-га лютага мінае 10 гадоў незалежнасьці Літвы.

У гутарцы з супрацоўнікам ТАСС літоўскі пасланьнік Балтрушайтыс сказаў: узаемаадносіны Літвы з СССР ад дню падпісаньня мірнага ўгавору заўсёды адрозьніваліся ўстойчываю тэндэнцыяю сапраўды добрасуседзкіх адносін. Як найбольш каштоўны момант у гэтых прыяцельскіх адносінах у першую чаргу трэба падкрэсьліць, што незалежнасьць Літвы неабходна для палітычнае раўнавагі ў Усходняй Эўропе і зьяўляецца адзнаю з умоў трывалае мыру. Гэтае жаданьне Савецкага Саюзу бачыць літоўскі народ вольным у яго нацыянальных межах было не раз пацьверджана ў міжнародных актах СССР і, зразумела, адыграла не другарадную ролю ва ўмацаваньні незалежнасьці Літвы, як міжнароднага фактару.

Перад выбарамі ў Польшчы.

СКАСАВАНЬНЕ СЬПІСКУ РАБ.-СЯЛ. АДЗІНСТВА Ў АКРУГАХ.

ВАРШАВА, 15-2. У Кракаве скасаваны акруговыя сьпісы рабоча-сялянскага адзінства (лявіцы ППС і сялянскага адзінства). У Чэнстахове скасаваны акруговы рабоча-сялянскі сьпіс.

ВЫБАРНЫЯ ФОКУСЫ.

Навагрудзкая выб. камісія зацьвердзіла сьпісан «Беларускага Сял.-Раб. Аб'яднаньня», але выкрэсьліла з яго кандыдатуры: Тарашкевіча, Матлы, Бушовіча, Ходзькі і Кузьміча, якія абвінавачаны па працэсе „Грамады".

У Віл. акрузе выкрэслен гр. Назарук.

За тэрытарыяльную аўтаномію.

На прадвыбарчым мітынгу нацменшасьцяў у Львове 6. пасол сыніст д-р Рэйх выказаўся за тэрытарыяльную аўтаномію для нацменшасьцяў Польшчы, якая павінна быць так уложана, каб яна крыўдзіць яўрэйскай людзкасьці.

НЯЎДАЧЫ ВЯДОМАГА П. ОБСТА.

Вядомы віленскі польскі чорнасоценец, фактычны рад. „Дзен. Вілен". п. Обст склікаў эндэцкі мітынг, на якім папрабаваў выступіць. Пасьля яго выступленьня падняўся гвалт, патухла лямпа, і Обст ледзьве здолеў уцячы непабітым. Гэта ня рэдкі з ім выпадак.

«Новая Россия» і польскія манархісты.

„Новая Россия"—тыдзёнік, які выдаецца ў Вільні расейскімі манархічнымі коламі, заклікае ўсіх расейцаў галасаваць на выбарах у сойм і сэнат за сьпісак „Беспарт. блёку супрацоўніцтва з урадам", на якім стаіць імя рад. «Слова» манархіста—Ідзі-Мацкевіча.

Канфіскацыя эндэцкіх адозваў

Урадавы камісар г. Вільні канфіскаваў перадвыбарчую адозву, выданую эндэцка-хадэцкім блёкам.

Арышт б. пасла Ледвоха.

Арыштован б. пасол сойму Ледвох, які быў адным з лідэраў партыі „Вызваленьне", а цяпер зьяўляўся сэкратаром партыі п. Домбскага.

КАНФІСКАЦЫІ.

Урадавы камісар г. Вільні канфіскаваў арышт на № 4 «Праваслаўнай Беларусі» за артыкулы «Блёк нацменшасьцяў і блёк супрацоўніцтва з урадам" і «Сумная гадавіна".

* * *

Урадавы камісар г. Вільні канфіскаваў № 12 «Бел. Крыніцы" за артыкул: «Дзікая забава паліцыі».

* * *

На аснове 129 арт. КК канфіскована адозва ППС, выданая саюзам земляробаў Польшчы.

АДКЛАД ПРАЦЭСУ „133".

«Кур'ер Віленскі» № 35 паведамляе, што «вялікі працэс (працэс „133" у Беластоку. Рэд.) проці членаў камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, прызначаны на 7 лютага г. г., адкладзен па тэхнічных прычынах. Новы тэрмін працэсу яшчэ ня вызначан».

ПРАЦЭС 5-ЦІ БЕЛАРУСАЎ.

ВАРШАВА, 15-2. У Вільні скончыўся разгляд справы 5 беларусаў, прыцягнутых да адказнасьці па абвінавачаньні ў шпіянажы. У ліку абвінавачаемых—жонка дэпутата сойму Баліна. Яна засуджана да 3-х гадоў зьняволеньня ў астрозе, іншыя абвінавачаемыя—да зьняволеньня па тэрміны ад 3-х да 4-х гадоў.

МЭЙШТОВІЧ У ВІЛЬНІ.

Міністр справядлівасьці п. А. Мэйштовіч разам з дырэктарам адміністрацыйнага дэпартаменту міністэрства справядлівасьці п. М. Сьвяткоўскім прыбыў у Вільню. У якой справе,—газэты не паведамляюць. Ці ня ў справе тольки суду над „Грамадой", які надыходзіць.

АДХІЛЕНЬНЕ АДДЗЕЛУ ДРУКУ ВАРШАЎСКАГА ПАСОЛЬСТВА СССР.

ВАРШАВА, 14-II. Газэты агалашаюць адхіленьне аддзелу друку паўнамоцнага прадстаўніцтва СССР у Варшаве, дзе гаворыцца, што «чуткі аб мярнуемым прыезьдзе савецкае дэлегацыі для гандлёвых перамоў у Варшаву не адпавядаюць сапраўднасьці».

САВЕЦКАЯ ЧЫГ. ДЭЛЕГАЦЫЯ ВЫЕХАЛА З ВІЛЬНІ.

Гэтымі днямі выехала з Вільні праз Стоўпцы ў Маскву нашая дэлегацыя, якая вяла з польскай дэлегацыяй перагаворы аб праектаваным транзіце без перагрузкі праз пагранічныя чыгуначныя станцыі.

Выбух у гуце.

Страшны выпадак здарыўся гэтымі днямі ў гуце «Чэнстахова» ў Ракаве. З прычыны неспадзяванага выбуху растопленай сталі стравожана параненa і папарана 14 рабочых.

Сьмерць б. пасла сойму.

У Сан-Рэмо памёр б. пасол сойму сыніст Кросьніг, рэдактар яўрэйскай газэты ў Львове „Тагеблят".

У АПОШНІ ЧАС.

(Атрымана а 1 гадз. уночы).

ПРЫВІТАНЬНЕ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ АД ПЛЕНУМУ ВЫКАНКОМУ КАМІНТЭРНУ.

МАСКВА, 16-2. 14-га лютага ўхвалена прывітаньне Чырвонай арміі, у якім гаворыцца:

«Чырвоная армія—армія пралетарскай рэвалюцыі, дзіцё Кастрычніка, абаронца яго заваёў, сталёвы меч прыгнечаных, эксплёатуемых усяго сьвету, бо ахоўнае Савецкі Саюз—крэпасьць сусьветнай рэвалюцыі, бо канчатковыя мэты Чырвонай арміі—зьнішчэньне эксплёатацыі ва ўсім сьвеце. Імпэрыялістычныя драпежнікі вострацъ зубы супроць першай сацыялістычнай дзяржавы. Прыгнечаныя абязздоленыя ўсяго сьвету разглядаюць гэту сацыялістычную дзяржаву, як сваю бацькаўшчыну, і гатовы ў любы момант разам з Чырвонай арміяй абараняць яе ад усіх ворагаў".

МАСАВАЕ АНУЛІРАВАНЬНЕ ЛЕВЫХ РАБОЧА-СЯЛЯНСКІХ СЬПІСКАЎ У ПОЛЬШЧЫ.

ВАРШАВА, 16-II. З усіх канцоў Польшчы атрымліваюцца паведамленьні аб масавым анулiраваньні левых рабоча-сялянскіх сьпіскаў. Па паведамленьню друку, масавае ануліраваньне сьпіскаў у Заходняй Беларусі можа мець вынікам тое, што ў сойм ня пройдзе ніводзін прадстаўнік запраўдна беларускіх палітычных груповак. Ануліраваньне робіцца на фармальных прычынах. Арыштован дэпутат незалежнай сялянскай партыі Бэк. Гэта ўжо восьмы па ліку дэпутат сойму, арыштаваны ў гэту перадвыбарчую кампанію.

За дзень.

Сапраўдны твар „міру ў прамысловасьці".

Клясавая барацьба ў Заходняй Эўропе абвастраецца такім тэмпам, аб якім яшчэ нядаўна ня можна было і марыць. Усяго некалькі месяцаў таму назад у Нямеччыне быў праведзен лёкаут тытуннічыкаў, і 100.000 рабочых аказаліся бяз працы. Наступны канфлікт у цяжкай жалезавырабоўваючай прамысловасьці ахапіў ужо 300.000 пралетарыяў і, урэшце, цяпер забастоўка мэталістаў сярэдняй Нямеччыны на воле нямецкай буржуазеі павінна прывесьці да лёкауту мэталістаў усёй Нямеччыны, г. зн. ужо 800.000 рабочых уцягваюцца ў барацьбу працы з капіталам.

Прычына такога размаху клясавай барацьбы крыецца ў наступным. У красавіку г. г. у Нямеччыне маюць быць пераглядзены калектыўныя дагаворы, якія ахопліваюць 6 млн. рабочых. Прадпрыёмцы, прадугледжваючы імкненьне рабочых змагацца за павялічэньне зарплаты і скарачэньне рабочага дню, узмоцнена рыхтуюцца да адпору. Часьцей усяго прадпрыёмцы самі пераходзяць у наступ, абвяшчаючы лёкаут. Прадпрыёмцы стараюцца не дапусьціць хоць бы маленькай перамогі рабочых, бо гэта паслужыла-б надзеяй і для іншых атрадаў нямецкага пралетарыяту. Для посьпеху гэтай барацьбы з рабочымі ў цяжкай прамысловасьці створан нават спэцыяльны фонд узаемадапамогі на выпадак забастовак і лёкаутаў, асабістая страхоўка капіталістаў ад страт у барацьбе з рабочай клясай.

Ня прыходзіцца гаварыць, што перад гэткім адзінствам прадпрыёмцаў рэфармісты і ня думаюць аб гэткім-жа адзінстве і ў пралетарскіх шэрагах. Якраз наадварот—рэфармісты ўсімі спосабамі перашкаджаюць стыхійнаму імкненьню рабочых выступіць адзіным фронтам.

У Англіі мы маем амаль гэткі-ж малюнак. Прадпрыёмцы ня спыняюць націску на рабочых, а рэфармісты заняты размовамі аб «міры ў прамысловасьці», г. зн. фактычна здраджаюць і прадаюць інтарэсы рабочых. Учарайшыя тэлеграмы з Англіі прыносяць новае пацьвярджэньне гэтага. У Дэрхемскім вугольным райёне «нэйтральны» старшыня—бюро па зарплаце вынесла пастанову аб далейшым зьнижэньні зарплаты гарнякоў. Згодна гэтай пастановы зьніжаецца як асноўная стаўка, так і процантная надбаўка да яе. Асноўная стаўка—зарплата 1879 г.—зьніжана на 2 пенсы, а надбаўка да яе—з 89 да 65 проц. У другім вугольным райёне Англіі, у Нортумбэрлендзе, толькі гэтымі днямі такі самы «нэйтральны» старшыня зьнізіў процантную надбаўку роўна ў два разы—з 80 да 40 проц.

У Чэхаславакіі вугольная прамысловасьць таксама становіцца арэнай барацьбы. 30 тысяч гарнякоў паставілі пачаць забастоўку за павялічэньне зарплаты на 20 проц.

Вывад напрашваецца сам сабой: цяпер як ніколі вынікі абвастрэньня барацьбы працы з капіталам у Заходняй Эўропе залежаць ад таго, наколькі і якім тэмпам будзе ажыцьцёўлен лёзунг кампартыі аб адзіным фронце рабочых і аб адхіленьні здраднічта рэфармістаў.

Банкруцтва мяшчанства ў Зах. Беларусі.

На папярэдніх выбарах у сойм і сэнат у 1922 г. галоўнымі канкурэнтамі беларускіх партый на абшарах Зах. Беларусі былі польскія нібы лявіцовыя, а фактычна мяшчанскія-угодніцкія партыі: «Вызваленьне», «Сялянская Партыя» і «ПНС».

Беларускія групіроўкі, якія ўвайшлі тады ў „Блёк Нацменшасьцяў", рабілі галоўны націск на нацыянальнае вызваленьне—замест больш зразумелае шырокім працоўным масам сацыяльнае праграмы.

Польскія мяшчанскія партыі, перафарбаваўшыся над беларусаў і выстаўляючы іхняя нацыянальны бок праграмы беларускіх партый, уваходзіўшых у блёк, увесь свой дэмагагічны спрыт скіравалі супроць беларускіх партый, увайшоўшых у «Блёк»,—у тым ліку і проці беларускага здыкалаў. Дзякуючы гэтаму і малой вазе палітычнай сьпелясьці беларускіх працоўных гушчаў польскаму мяшчанству ўдалося выйграць аж палавіну сялянска-работніцкіх галасоў Зах. Беларусі.

З бегам часу ў соймавай працы выявіўся сапраўдны твар як беларускіх зблёкаваных згодніцкаў, гэтак асабліва і здэмаскаваны твар польскіх мяшчанскіх элемэнтаў. Лёзунгі, выхапленыя з паветра ў часе выбараў, забыліся, як непатрэбнае сьмяцьцё, і выяўленыя буржуазныя напіхачы ўсю сваю энэргію скіравалі на прадажу буржуазеі інтарэсаў тых, каму яны на выбарах абяцалі залатыя горы.

У разультаце гэтага мы бачым расклад як беларускага, гэтак і польскага соймавага прадстаўніцтва ад Зах. Беларусі, поўнае банкруцтва беларускіх і польскіх мяшчанскіх груповак і магутнае ўзварушэньне і арганізаваньне беларускіх працоўных грамадаў, выявіўшых гэтым сваю поўную салідарнасьць з радыкальнымі элемэнтамі.

Ратуючы сваю сітуацыю, беларускае і польскае мяшчанства пайшло розными дарогамі, скіраванымі да адзнае мэты—здабыцьця мандатаў. Калі беларускае мяшчанства выбрала ўжо працоўную дарожку (Блёк Нацменшасьцяў), дык польскае мяшчанства кінулася на шлях кансалідацыі ўсіх збанкрутаваных псэўда-правадыроў, падшываньня пад беларускі працоўны шыльд і злучэньня хоць-бы з псэўда-беларускімі групамі Гурына, Ўмястоўскага і інш.

Карыстаючыся прыхільнасьцю высокіх гэтага сьвету і немагчымасьцю радыкальнай прэсы з прычыны хранічных канфіскатаў паведаміць аб усім працоўным масы, яны ізноў хочуць заваяваць страчаныя пазіцыі.

Аднак можна быць пэўным, што беларускія працоўныя масы ўжо да таго сьвядомыя, што выкінуць падобных «дзеячоў» на сьметнік палітычных адкідкаў.

Пэрспэктывы выбараў.

З кожным днём пэрспэктывы паступаючых выбараў усё больш высьвятляюцца. Ня гледячы на ўсе перашкоды, пры якіх прыходзіцца працаваць незапраданым радыкальным беларускім элемэнтам, можна сьмела ўжо сказаць, што, дзякуючы значнай паліт

У Саюзе ССР.

Прафсаюзы СССР на дапамогу нямецкім мэталёўцам.

МАСКВА, 15-2. Прэзыдыум УЦСПС перадаў праз савецкую сэкцыю Міжрабпому на дапамогу бастуючым мэталёўцам Сярэдняе Нямеччыны 10 тысяч рублёў з фонду міжнароднае салідарнасьці пры УЦСПС.

Як рэалізуецца сялянская пазыка ў РСФСР.

МАСКВА, 15-II. Рэалізацыя пазыкі ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі асабліва інтэнсыўна праходзіць на Паўночным Каўказе, на Урале, у Варонескай, Іванаво-Вазьнясенскай і Тамбоўскай губ. На 1-га лютага Паўночны Каўказ даў 2.236 тысяч руб., Урал—звыш мілёну руб., Варонеская губ.—400 тысяч руб. Да 15-га лютага па РСФСР разаслана аблігацый на 45 мільёнаў руб. Зараз ужо па ўсіх райёнах разасланы аблігацыі. У працягу бліжэйшых двёх месцы будуць цалкам задаволены аблігацыямі.

Бюджэтныя паступленьні ў РСФСР за 1 квартал.

МАСКВА, 15-II. За першы квартал бягучага бюджэтнага году ў бюджэт РСФСР паступіла прыбыткаў 193.987 тысяч руб., ці 20,3 проц. агульнае гадавое сумы, зацьверджанае СНК РСФСР на 1927-28 г. Зроблена выдаткаў за першы квартал 187.193 тыс. руб., з якіх адлічана ў мясцовыя сродкі 77 мільёнаў 553 тыс. руб. і выдадзена па фінансаваньне народнае гаспадаркі 27.415 тыс. руб.

З жыцьця Югаславіі.

(АБВАСТРЭНЬНЕ ПАЛІТЫЧНЫХ СПРЭЧАК.— ПЕРАД СТАБІЛІЗАЦЫЯЙ ДЫНАРА).

I.

На ўсім працягу свайго дзесяцігадовага існаваньня Югаславія застаецца падзеленаю на два вялікія палітычныя лягеры. Базадьба паміж гэтымі лягерамі то прыціхае, то ізноў абвастраецца, але поўнага прымірэньня няма і доўга ягоа ня будзе, бо асноўнымі прычынамі барацьбы паміж «старою» і „новай Сэрбіяй" зьяўляюцца глыбокія розьніцы паміж імі гаспадарчага, сацыяльнага і культурнага характару. Дачыненьня да старое Сэрбіі былыя аўстра-вэнгерскія правінцыі: Босьнія, Герцагавіна, Далмацыя, Краацыя, значна ад яе розьняцца, асабліва-ж апошняя, выхадцы з якой займаюць тон усяму апазыцыйнаму руху проці цэнтралістскае палітыкі белгардзкага ўраду. Сэрбія—праваслаўная, Краацыя—каталіцкая. У Сэрбіі шрыфт у аснове расейскі, у Краацыі—лацінскі; у Сэрбіі—палова вынісьменных, у Краацыі—адзіночныя процанты; Сэрбія—амаль выключна земляробскі край, Краацыя—больш дыферэнцыравана клясава і г. д. А коратка, у адной ультрадарнай формуле выказваюць гэта нямецкія газэты: „Краацыя—сярэдняя Эўропа, Сэрбія—Балканы".

Буржуазея старой Сэрбіі сыстэматычна адсоўвае буржуазею новадалучаных правінцый ад удзелу ў кіраваньні дзяржаўным жыцьцём, адыскае ад найлепшых дзяржаўных пасад. Буржуазным дзеячам новае Сэрбіі ставіцца ў віну недахват у іх сэрбскага патрыётызму, іх ранейшы апартунізм у адносінах да аўстра-вэнгэрскае Ўзады, ў зьвязку—нясьціханыя скандалы, узаемная грызьня і палрокі. Калі ў скупшчыне (парляманце) пачынаецца лаянка паміж дэпутатамі старой і новай Сэрбіі, дык падчас справа не абмяжоўваецца адными толькі „моцнымі" словамі, але даходзіць і да кулачнае расправы.

Гады тры таму назад, калі правадыром нова-сэрбскіх апазыцыянераў быў Сьцяпан Радзіч, сэрбскія скандалы прыцягвалі да сабе ўвагу нават далёка за межамі Югаславіі. У 1925 г. так званы сэрбска-краацкі канфлікт быў часова ўладжаны ўзаемнымі ўступкамі. К таму часу абвастрэньне барацьбы дайшло да таго, што прыходзілася рэальна лічыцца з магчымасьцю адасабленьня ад Югаславіі часткі заходніх правінцый і заснаваньня новае дзяржавы. Надалоханыя такою пэрспэктывою праводыры правага буржуазеі з аднаго боку і белградзкія цэнтралісты з другога боку найшлі на ўзаемныя ўступкі, замірыліся, а потым адразу-жа пасьля замірэньня супольнымі сіламі пачалі паход проці камуністаў. Югаславія ўвайшла ў паласу ўзмоцненае рэакцыі. Але паразуменьне паміж буржуазеяй старой і новай Сэрбіі, як і трэба было чакаць, аказалася толькі часовым перамірыем, і пачатак 1928 году прынёс новае абвастрэньне барацьбы паміж імі. Замежныя карэспандэнты пішуць, што такіх „моцных" слоў аб замежнай і ўнутранай палітыцы югаслаўскага ўраду, як у пачатку г. г., раней ніколі ня чуваць было ў скупшчыне.

Самае галоўнае абвінавачаньне, якое кідаецца на адрасу белградзкага ўраду,—гэта, што ён глядзіць на новадалучаныя правінцыі, як на калёніі, цягне з іх усё, што можа, а ўзамен не дае нічога добрага. Усе вышэйшыя пасады ня толькі ў цэнтры, але нават і ў самых далучаных правінцыях занаўняюцца выхадцамі з старое Сэрбіі; усё-жа новыя пабудовы робяцца толькі ў старой Сэрбіі; падаткі ў новадалучаных правінцыях вышэйшыя, чым у старой Сэрбіі; урад проста грабіць новадалучаныя правінцыі і за іх кошт падымае дабрабыт старое Сэрбіі. „Сялянска-дэмакратычная каліцыя" буржуазных дзеячоў з новае Сэрбіі крытыкуе ня толькі палітыку белградзкага ўраду ў сваіх родных майсцовасьцях, але датыкаецца таксама да самага дражлівага і балючага пытаньня ў дзяржаўным жыцьці Югаславіі—„македонскага пытаньня" і заўважае, што дзейнасьць македонскага рэвалюцыйнага камітэту ёсьць простым вынікам хронае, няўмелае палітыкі ўраду. Таксама, як у адносінах да заходніх, былых аўстра-вэнгэрскіх правінцый, так і ў адносінах да Македоніі апазыцыя трэбуе строгага выкананьня канстытуцыі 1921 году, якая гарантуе роўнасьць усім правінцыям, але дагэтуль застаецца на паперы.

На ўсе гэтыя напрокі „старасэрбы" адказваюць, што старая Сэрбія зьнішчана вайною і дзеля гэтага зусім натуральна, што падаткі ў ёй меншыя, што ў ёй трэба шмат траціць на адбудову зьнішчанага. Затое рэпарацыйныя плацежы, якія Югаславія атрымлівае, належаць па сутнасьці толькі старой Сэрбіі, а ідуць у агульна-дзяржаўную казну.

Не зважаючы на пробы прымірэньня з боку ўмеркаваных палітыкаў,—„прэцанскі" і «сэрбіанскі фронт» стаяць наранейшаму адзін проці другога. Югаславія застаецца падзеленай на два лягеры.

II.

У эканамічным жыцьці Югаславіі гатуецца важная падзея: афіцыяльная стабілізацыя дынара, які ўжо больш двох гадоў трымаецца на адным узроўні, без рэзкіх хіснаньняў курсу. Вось ужо 29 месяцаў, як дынар на замежных біржах катыруецца на 9,13 швайцарскіх франкаў за 100 дынараў (1 дынар роўны прыблізна 3,5 капеек). Становішча балянсу замежнага гандлю, запас цьвёрдых замежных валютаў у дзяржаўным банку, урэгуляваньне старых замежных даўгоў і даныя замежных крэдытаў стваряюць неабходныя падставы дзеля стабілізацыі.

Ужо ад 1923 году балянс замежнага гандлю Югаславіі стаў актыўным, даючы ў 1924 г. рэкордныя перавышэньне вывазу над увозам у 1,3 мільярды дынараў (каля 45 млн. руб.). Праўда, у мінулым годзе, у зьвязку са зьменшаным ураджаем, ізноў зьявіўся дэфіцыт (за 10 месяцаў 0,75 мілярда дынараў), але яго сувязь з ураджаем бясспрэчна і ён мае часовы характар.

Ваенныя і даваенныя даўгі Югаславіі знаходзяцца на шляху да канчатковага ўрэгуляваньня. Даўгі Англіі і Злучаных Штатаў ужо ўрэгуляваны. Застаецца толькі ўрэгуляваць даўгі Францыі, аб чым вядзе перамовы ў Парыжы міністр замежных спраў Марковіч.

У дзяржаўным банку ёсьць паперы звычны запас замежных цьвёрдых валютаў. 15 красавіка 1927 году іх было толькі на 553 мільёны дынараў (19,4 млн. руб.). Пасьля атрыманьня амэрыканскае пазыкі ўвосень 1927 г. запас гэты падняўся да 1700 мільёнаў дынараў (59,5 млн. руб.), але ўжо к 1 сьнежня ўпаў да 1150 млн. дын. (40,25 млн. руб.). З такім запасам заварыць стабілізацыю нельга, і правядзеньне яе залежыць ад атрыманьня новае замежнае пазыкі, аб чым ужо вядуцца перагаворы. Новая-ж пазыка будзе азначаць яшчэ большае падпарадкаваньне Югаславіі замежнаму капіталу, яшчэ большы вынік ім югаслаўскіх працоўных масаў.

Таксама і раўнавага ў бюджэце дасягаецца з вялікімі цяжкасьцямі, адначасовым націскам на працоўныя масы ў двох шляхах: зьмяншэньнем расходаў на сацыяльна культурныя патрэбы (асьвету, ахову народнага здароўя) і павялічэньнем падаткаў да крайніх межаў выносьлівасьці югаслаўскага селяніна. Падгатоўка стабілізацыі дынара праводзіцца цалкам за кошт працоўных масаў.

М. С.

СІМЕ МАРКОВІЧУ ПАГРАЖАЕ РАСТРЭЛ.

ВЕНА, 15-II. Водпуг паведамленьняў з Белграду, на працэсе Марысвіча ўжора быў скончаны допыт сьведак. Пракурор у прамове абвінавачаньня заявіў, што камуністы імкнуцца заснаваць фэдэрацыйную савецкую рэспубліку на Балканах і наладжваюць нібы тэрарыстычныя замахі проці выдатных дзеячоў Югаславіі.

Для ўсіх падсудных пракурор патрабуе пакараньня сьмерцю, ці пры зьмяшчаючых абставінах—зьвяволеньня ў астрозе на 20 гадоў.

Рэалізацыя пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі.

ХАЛОПЕНІЦКІ РАЙЁН, МЕНСКАЙ АКРУГІ, ЯШЧЭ НЕ ПРЫСТУПІЎ ДА РЭАЛІЗАЦЫІ ПАЗЫКІ.

Гэтак далёка не заедзеш.

(Менская округа).

Падрыхтоўчая праца па рэалізацыі пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі ў Менскай акрузе пачалася раней, чымся ў іншых округах.

У райёнах арганізацыйная праца разгорнута добра: арганізаваны райкамісіі, сходы сялян усіх населеных пунктаў, абгаварваюцца пытаньні рэалізацыі на пленумах сельсаветаў і г. д.

Аднак, уся савецкая грамадзкасьць у гэту працу ня ўцягнута, а бяз гэтага рэалізацыя належным чынам ня пойдзе.

У райёнах арганізавана вельмі густая сетка агентуры і суб'агентуры. Аднак, трэба адзначыць, што тэмп рэалізацыі вельмі слабы. Асабліва дрэнна праходзіць рэалізацыя пазыкі ў Халопеніцкім, Бягомльскім і Койданаўскім райёнах. На Бягомльскім райёне рэалізавана на 330 руб., па Койданаўскім—на 547 руб., а па Халопеніцкім—нічога.

Па ўсіх райёнах Менскай акругі рэалізавана на 41.939 руб. Калі такім тэмпам праца па рэалізацыі пазыкі будзе ісьці і далей, то вызначаная сума ня будзе рэалізавана.

У апошні час кампанія рэалізацыі пазыкі ў райёнах узмацнілася: на месцы выехалі прадстаўнікі з акругі, галоўным чынам, ад акрфінаддзелу; старшыні РВК-ў выкліканы ў акруговую камісію, каб зрабіць даклады аб ходзе кампаніі і аб недахватах, якія ёсьць у райёнах; на гораду завербавана контрагентура (35 устаноў) і г. д. Але гарадзкая контрагентура, напрыклад, пакуль што не вылуляе да рэалізацыі пазыкі ніякай зацікаўленасьці і працуе як бы пад прымусам. Гэта пацьвярджаецца тым, што па гораду рэалізавана толькі на 2.900 руб.

Тыя арганізацыі і ўстановы, якія непасрэдна маюць дачыненьне з сялянамі, як, напрыклад, Белсельсаюз, дом селяніна і інш. да гэтага часу не рэалізавалі ні адной капейкі. Нават Белсельбанк рэалізаваў толькі на 430 рублёў.

Нашы прыгарадныя сельсаветы—Пятроўшчынскі і Азярышча-Сьляпянскі, дзе ёсьць усе магчымасьці і спосабы да рэалізацыі пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі, далі вельмі мізэрныя сумы: першы—60 руб., а другі—30 руб.

Такім чынам, усяго па акрузе рэалізавана толькі на 44.839 руб.

Адгэтуль вывад: тэмп рэалізацыі зусім нікчэмны.

Прымаюцца канкрэтныя мерапрыёмствы да рэалізацыі, як, напрыклад, прэміраваньне лепшых сельсаветаў с.-гаспадарчымі машынамі, радыё-прыёмнікамі і інш., але гэтага мала. Неабходна, каб уся грамадзкасьць, асабліва рабочыя праз свае шэфскія арганізацыі зрабілі ў гэтай справе адпаведны ўплыў і правялі шырокую кампанію па высьвятленьні важнасьці пазыкі ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі.

Колькі рэалізавала Меншчына.

(Па тэлефону ад нашых карэспандэнтаў).

Бярэзіна, 16-2. З пачатку кампаніі да 15 лютага ў Бярэзінскім райёнё рэалізавана аблігацый сялянскай пазыкі на 5.000 руб., з якіх на 1.295 руб. за апошнія 7 дзён.

Грэск, 16-2. У Грэскім райёне за апошні тыдзень прададзена аблігацый сялянскай пазыкі на 605 руб.; усяго-ж з пачатку кампаніі рэалізавана толькі на 1482 р. 50 кап.

Заслаўль, 16-2. З пачатку кампаніі ў нашым райёне рэалізавана сялянскай пазыкі на 3370 р., прычым з іх на 2267 руб. прададзена за апошнія сем дзён лютага.

Капыль, 16-2. Усімі контрагентамі па Капыльскім райёне прададзена аблігацый сялянскай пазыкі да 15 лютага на 2540 р., з іх большая палова прыпадае на апошні тыдзень.

Азярышча, 16-2. У нашым сельсавеце пакуль што прададзена аблігацый сялянскай пазыкі толькі на 117 руб. 50 к., з іх на 87 руб. 50 кап. за апошнія 7 дзён. Мясцовым працаўнікам трэба падумаць аб тым, каб бліжэй падыйсьці да селяніна.

Пятроўшчына, 16-2. Чытаем у газэтах, што па ўсіх мясцох разгортваецца праца па рэалізацыі пазыкі. Наколькі пазыка карысна для сялянскай гаспадаркі, усім вядома, але ў нашым сельсавеце зусім ня дбаюць аб гэтай важнай справе. Да першага лютага прадалі аблігацый на 50 р., а з таго часу больш нічога не прададзена.

Віцебшчына да 13 лютага рэалізавала на 16500 руб.

(Па тэлеграфу ад уласн. карэспандэнта).

Па ўсёй Віцебскай акрузе ад пачатку кампаніі да 13 лютага рэалізавана пазыкі ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі на 16500 руб.

Паасобныя райёны далі падпіскі: Ліозьненскі—857 р. 50 к., Сураскі—2315 р. Гарадоцкі—1800 р., Высачанскі—182 р. 50 к., Сеньненскі—490 р., Чашніцкі—500 руб., Сіроцінскі—140 р., Бешанковіцкі—1417 р. 50 к., Межыцкі—20 р., Езярышчанскі—28 р. і Віцебскі—150 руб.

Наогул, у Віцебшчыне падпіска на пазыку ідзе слаба, на што адпаведным органам акругі трэба зьвярнуць пільную увагу.

КУРСАНТЫ БЕЛАРУСКАЙ ВАЙСКОВАЙ ШКОЛЫ ПАДПІСАЛІСЯ НА 4260 РУБ.

Курсанты Беларускай вайсковай школы падпісаліся на пазыку ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі на 4260 руб. Трэба адзначыць, што курсанты атрымліваюць невялікую пэнсію. Адзін курсант падпісаўся на 100 руб.

ЧЫГУНАЧНІКІ ДАПАМАГАЮЦЬ РЭАЛІЗАЦЫІ ПАЗЫКІ.

Вучпрафсож Маскоўска-Балтыцка-Беларускай чыгункі за апошнія сем дзён лютага распаўсюдзіў аблігацый сялянскай пазыкі сярод сялян на 300 руб.

УДЗЕЛ КРЭДЫТНАЙ СЫСТЭМЫ Ў РЭАЛІЗАЦЫІ ПАЗЫКІ.

На пасяджэньні Цэнтральнай Камісіі садзейнічаньня рэалізацыі сялянскай пазыкі Дырэктар Белсельбанку т. Дубіна ўнёс прапанову аб тым, каб Лесбел пераводзіў свае грошы на месца расплаты праз крэдытную сыстэму Белсельбанку; расплату на мясцох будуць праводзіць крэдытныя таварыствы. Дзякуючы такой сыстэме, будзе магчымасьць больш плянава рэалізаваць сялянскую пазыку.

Супроць гэтага выступілі т. т. Наўлянскі і Раванчук, спасылаючыяся на тое, што Лесбел не зьяўляецца такой арганізацыяй, якая можа свячасова вылічваць за распраноўкі, і за кожнае спазьненьне выдачы зарплаты будуць абвінавачаць крэдытную сыстэму. З другога боку, гэта пытаньне не ўваходзіць у кампетэнцыю абмеркаваньня Цэнтральнай Камісіі.

Прапанову т. Дубіны Камісія настанавіла перадаць на разгляд адпаведных устаноў

Рэалізавалі на 56275 руб.

ГОМЕЛЬ, 16-2. (Ад ул. кар.). Рэалізацыя пазыкі ў акрузе пачынае ўзмацняцца. На 15 лютага па акрузе рэалізавана на 56275 р. Першае месца па рэалізацыі пазыкі займае Брагінскі райён, які рэалізаваў на 13 тысяч руб. З посьпехам рэалізуюцца аблігацыі пазыкі ў Хойніцкім, Чачэрскім і Рэчыцкім райёнах. Зусім слаба ў Веткаўскім райёнэ, які рэалізаваў толькі на 750 р. У Цярэхаўскім і Буда-Кашалёўскім райёнах рэалізацыя паранэйшаму адстае. Па гэтых двух райёнах усяго рэалізавана на 2000 р.

Акружкомам КП(б)Б вылучаны ўпаўнаважаныя для ўзмацненьня падпіскі і праверкі правядзеньня кампаніі на мясцох.

Вучні Глускай сямігодкі падпісаліся на 67 р.

БАБРУЙСК, 13-II. (Ад ул. кар.). Распаўсюджваньне пазыкі ў сельскіх мясцовасьцях мае наступны выгляд: у Піравіцкім сельсавеце, Жлобінскага р., ужо распаўсюджана часовых пасьведчаньняў пазыкі на 445 руб. (11 проц. агульнага заданьня); пленум Стара-Дароскага селькому ўзаемадапамогі падпісаўся на 90 руб.; Дацэвіцкі сельком, Клічаўскага р., закупіў аблігацый на 20 руб. Пленум Клічаўскага райённага камітэту ўзаемадапамогі пастанавіў усім сялянскім камітэтам падпісацца на 20 руб., а райённаму—на 50 руб. У савецкай гаспадарцы Жылічы рабочыя за адзін дзень падпісалася на 300 руб.

Камсамольцы таксама не адстаюць у справе рэалізацыі пазыкі. Так, Гарадкоўская камсамольская ячэйка падпісалася на 40 руб., вучні Глускай сямёхгодкі падпісаліся на 67 руб.

Па БССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Першыя крокі па самаабкладаньні.

Узда, 16-2. *(Па тэлеф. ад уласн. карэспанд.).* Насельніцтва Узьдзенскага райёну зрабіла першыя канкрэтныя крокі па самаабкладаньні. На трох вёсках гэтага райёну ёсьць наступныя вынікі.

Вёска Забалоцьце на сходзе адногалосна пастанавіла адрамантаваць на свае сродкі грэблю. Кошт гэтай працы —300 руб.

Вёска Зінкавічы пастанавіла адрамантаваць дарогу, што будзе каштаваць—350 руб.

Сяляне вёскі Зіркава пастанавілі закончыць пабудову школы і ўсіх школьных будынкаў за вясковыя сродкі.

Абкладаньне прыбытковым падаткам.

ГОМЕЛЬ, 16-II. У акрузе распачата абкладаньне прыбытковым падаткам. Непрацоўны элемент стараецца ўкрыць свае заняткі. Пры запаўненьні дэкларацыі, як правіла, указваюцца сумы нязначных прыбыткаў.

Некаторыя пераводзяць сваю маемасьць на сваякоў. Ёсьць выпадкі, калі жонка, маючая гандаль, пераводзіць маемасьць на мужа-беспрацоўнага. Скупшчыкі выкарыстоўваюць часамі сялян з мэтай купілі для іх жывёлы і ўбою ня прыватным спосабам.

Практыкуюцца выезды невядома куды. Некаторыя падбіраюць маемасьць, якая на каштоўнасьці далёка не накрывае падатку. Некаторыя для наведваньня фінадзелу маюць спэцыяльную вопратку.

Сярод самагужнікаў і рамесьнікаў ёсьць значная частка, якія трацяць у некаторай ступені свой працоўны выгляд. Калі іх абкладаюць падаткам, яны пачынаюць крычаць, што вось абкладаюць мяне саматужніка, і ў той жа час набываюць маемасьць у 8-10 тысяч рублёў.

Падатковы апарат усе гэтыя хітрасьці аддзіне. Аднак без належнага садзейнічаньня ўсіх арганізацый і членаў прафсаюзу справіцца цяжка. Таму Акрфінадзел зьвярнуўся з заклікам да ўсіх членаў саюзу дапамагчы яму ў выкрыцьні хітрыкаў прыватнікаў.

БЕЛАРУСІЗАЦЫЯ ПРАФСАЮЗНАГА АПАРАТУ.

Гомель, 15-2. Прэзыдыум Акрпрафсавету на пытаньне аб беларусізацыі саюзнага апарату зьвяртае максімум увагі. Гэтымі дніні будуць заслуханы даклады шэрагу саюзаў аб мерапрыёмствах у галіне пераходу на беларускую мову. Выяўлена, што на запытаньні, прысланыя на беларускай мове, адказы даваліся на той-жа мове. На запытаньні саюзаў шэйнікаў і гарбароў будуць даваца адказы на ўрэйскай мове. З студзеня 1929 г. праца Прэзыдыуму АСПС і пленумаў будзе пераведзена на беларускую мову.

ПЕРШЫМІ ЗДАЛІ ПАДАТАК.

Мазыр, 16-II. Сяляне Азяранскага сельсавету, Тураўскага райёну, і Кармянскага сельсавету, Караліскага райёну, першымі ў Мазырскай акрузе яшчэ 4 лютага поўнасьцю ўплацілі належны з іх сельска-гаспадарчы падатак да тэрміну.

Як відаць, у гэтых сельсаветах праца праводзілася добра і само сялянства выказала сваю сьвядомасьць.

Можна чакаць такіх-жа посьпехаў і ў галіне ўплаты страхоўкі, а таксама ў распаўсюджваньні аблігацый пазыкі ўзмацненьня сялянскай гаспадаркі.

ПАСТУПЛЕНЬНЕ СТРАХОЎКІ.

Гомель, 15-2. У паступленьні страхавых плацяжоў маецца некаторы зрух. На 10 лютага процант выкананьня па гарадзкіх мясцовасьцях складае 86, па сельскіх 74. Хойніцкі райён запярэдзіў ліквідацыі страхавой запазычанасьці. Няўзысканых засталося 1002 руб. На Рэчыцы—457 руб., на Гомлю—2497 р. Да 15 лютага ў названых райёнах страхавая запазычанасьць будзе зьліквідавана.

Застаецца як і раней Веткаўскі райён. Няўзысканых засталося 35 тысяч рублёў. У Рэчыцкім райёне паступленьне праходзіць слаба. Паступіла 58 проц.

БУДЗЕ ДОБРЫ ДОМ ІНВАЛІДАЎ.

Бялынкавічы, 15-2. У Бялынкавічах Галоўсацстрах мяркуе дабудаваць і абсталяваць вялікі будынак, у якім будзе зьмешчаны дом інвалідаў на 70 чалавек. На гэтую мэту мяркуецца асігнаваць 15.000 руб. Пабудова распачнецца гэтай вясной і ўвосень дом будзе ўжо адчынены. Пры доме асадца 3 дзес. саду і 4 дзес. гароду. Мяркуецца арганізаваць 2 майстэрні—шавецкую і кравецкую.

ПАЗЫЧЫМ ДЗЯРЖАЎНЕ!

Рэалізацыя пазыкі ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі толькі разгортваецца. Яшчэ і на сёньнешні дзень ёсьць паасобныя сяляне і нават цэлыя вёскі, якія мала ведаюць аб пазыцы, яе значэньні і карысьці для сялянства. Тлумачыцца гэта, галоўным чынам, тым, што не хапае прапагандыстаў, а тым, што ёсьць, ня могуць адпачасова ахапіць увесь райён. Трэба сказаць, што ў райкоме, на партактыве і ўва ўсёй партыйнай, а таксама камсамольскай арганізацыях гэта пытаньне прапрацавана досыць добра. Праведзена работа і сярод беспартыйнага актыву. Зараз па ўсяму райёну мацуецца сетка контр-агентуры, для чаго прыцягнута вясковая інтэлігенцыя: настаўнікі, загадчыкі хат-чытальняў, дактары і інш. Найбольш актыўнымі з іх зьяўляецца настаўніцтва, якое ўзялося шчыра за гэтую работу. Неяк у баку стаяць аграномы—яны яшчэ не разварушыліся, але будзем спадзявацца, што ўсё-ж і яны возьмуцца за працу, бо: «лепей позна, чым ніколі»...

Цяжкасьці, якія сустракаюцца пры правядзеньні гэтае кампаніі, і перашкаджаюць хуткаму распаўсюджаньню пазыкі, наступныя: а) надышоў тэрмін узносу сельска-гаспадарчага падатку, б) вядзецца падвышэньне паёў у каапэрацыю і в) трэба ўносіць страхоўку. Усё гэта да некаторай ступені адбіваецца на правядзеньні работы, зацягвае рэалізацыю пазыкі, бо селянін у першую чаргу клапаціцца, каб ня быць нядоімшчыкам дзяржавы.

Як-жа сустрэла сялянства пазыку?

У большасьці добра. Былі паасобныя выступленьні кулакоў, якія імкнуліся сарваць работу, але гэта ім не ўдалося. У вёсках, дзе праведзена тлумачэньне выгад ад пазыкі для паасобнага селяніна—пагалоўнае жаданьне набываць аблігацыі. Гэта відаць з наступных водзываў сялян аб пазыцы:

Агульны сход сялян в. Лысоцевічы, Шапялёўскага с.-с., адабрае мерапрыёмствы ўраду аб выпуску дзяржаўнае ўнутранае пазыкі ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі, бо гэта пазыка выгадна як для дзяржавы, так і для сялянства. Лічым неабходным, каб кожная гаспадарка набыла аблігацыю".

„Мы, сяляне Астрашыцкага сельсавету, адабраем палітыку савецкай улады ў выпуску пазыкі ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі таму, што гэта пазыка карысна як для дзяржавы, так і для кожнага селяніна ў прыватнасьці. Мы выносім пастанову, каб ня было ніводнай сялянскай гаспадаркі, якая ня купіла-б аблігацыі".

Удзел працаўнікоў нізавых савецкіх органаў і актыву, які гуртуецца вакол яго, таксама вялікі. Яны шчыра бяруцца за рэалізацыю пазыкі і паперш пачынаюць купляць пазыкі самі.

„Першым, як прыклад, купіць па адной аблігацыі пазыкі прэзыдыуму сельсавету (Прудзішчанскі с-с.), па палове ці па адной чэрці ўсім членам сельсавету, членам камітэту с. узаемадапамогі і настаўніцтву".

Мясцовыя працаўнікі нізавых савецкіх органаў і актыў лічаць неабходным распаўсюдзіць кантрольную лічбу пазыкі ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі цалкам.

«Заслухаўшы даклад аб пазыцы ўзмацненьня сялянскае гаспадаркі, пленум Шапялёўскага с-с. адабрае мерапрыёмствы ўлады і лічыць неабходным распаўсюдзіць кантрольную лічбу, якая дадзена для сельсавету».

Аднак, ня ўсюды яшчэ добра ўсе зразумелі важнасьць сваячасовае рэалізацыі пазыкі. Маюць месца нядбайныя адносіны да гэтае справы. Так, адзін старшыня сельсавету, нават кандыдат партыі, заявіў, што «не яго справа займ[illegible]зыкаю—на гэта ёсьць прадстаў[illegible] райёну, няхай ён і вядзе гэту [illegible]у»... Адным словам: «Мая хата з [illegible]ю, я нічога ня знаю»... Але зараз [illegible] наступіў пералом і сярод гэтага кола працаўнікоў.

Што неабходна для таго, каб пасьпяхова распаўсюдзіць пазыку:

1. Прымацаваць да кожнага сельсавету на 2-хмесячны тэрмін пастаянных працаўнікоў ад райёну.

2. Правесьці работу з аграномамі, каапэратарамі і працаўнікамі лясьніцтва дзеля найбольшага ўцягненьня іх у справу рэалізацыі пазыкі.

3. Неабходна вылучыць больш лік контрагентаў, ня менш як 8-10 чалавек на сельсавет, з тым, каб яны маглі наведаць кожную сялянскую хату.

4. Райённай тройцы прасачыць за тым, каб у кожнай вёсцы былі праведзены сходы па папулярызацыі пазыкі, а дзе гэта яшчэ ня зроблена, накіраваць туды прапагандыстых для правядзеньня гэтае работы.

5. Акруговаму шэфскаму таварыству неабходна наладзіць выезды ў падшэфныя вёскі дзеля правядзеньня сходаў па папулярызацыі пазыкі.

Толькі пры выкананьні ўсяго гэтага можна будзе мець надзею на свячасовае распаўсюджваньне пазыкі, што ў значнай меры дапаможа савецкай дзяржаве перамагчы шэраг цяжкасьцяй на гаспадарчым фронце.

Перадавая частка сялянства добра разумее гэта і заўважае, што яно пазычыць дзяржаве і гэтым самым прыме ўдзел у будаўніцтве сацыялістычнае гаспадаркі.

І. Гурскі.

Астраш.-Гарадзецкі раён, Менская акруга.

Перад новымі выбарамі.

Ужо цяпер можна сказаць, што год, у які мы і ўвесь сьвет уступілі, будзе вельмі багаты ўсялякімі выпадкамі на міжнародній арэне. Перш усяго дзеля таго, што ў працягу яго адб дуцца выбары ў парляманты трох вялікіх дзяржаў Эўропы: Англіі, Францыі і Нямеччыны, а таксама і ў нашай суседкі Польшчы; апрача таго, у самым пачатку 1929 г. у Злучаных Штатах Паўночнай Амэрыкі адбудуцца выбары прэзыдэнта.

Уже гэтыя вялікага значэньня моманты ў жыцьці народаў могуць унесьці значныя зьмены ў іх палітыку і так ці інакш адбіцца на міжнароднай сітуацыі.

* * *

Апошнія выбары ў ангельскую палату дэпутатаў у канцы 1924 году прынесьлі, як вядома, поўную перамогу кансэрватыўнай партыі. Дзьве трэціх мандатаў прыпала на гэтых выбарах тым самым торам, якія не далей, як год перад тым (у сьнежні 1923 г.), змушаны былі аддаць улаву ў рукі «рабочага» габінэту п. Рамзея Макдональда, правадыра «рабочай партыі». Аднак, становішча габінэту Макдональда было вельмі нязэўным, бо ліберальная партыя працы была слабейшай у парляманце за адных толькі кансэрватараў і толькі разам з лібераламі Лёйд Джорджа і Асквіта магла падтрымліваць свой урад. Не падтрыманы ў скорым часе лібераламі ўрад Макдональда, які ня меў да ня [illegible] мець свайго ўласнага шляху, зваліўся на новых выбарах кансэрватары выкарысталі нацьвёрдасьць і неяснасьць палітыкі Макдональда і, выдумаўшы ў дадатак вядомую гісторыю з «лістом Зіноўева», атрымалі на выбарах патрэбную ім большасьць галасоў.

Калі аднак мы цяпер паглядзім на пэрспэктывы надыходзячых выбараў, дык шансы кансэрватараў не прадстаўляюцца так ружова, як тры гады таму назад. Вялікі гаспадарчы крызіс, найлепшым доказам якога была агульная і вугольная забастоўкі ў 1926 г., хранічна неўрэгуляваная справа беспрацоўя і завостраныя сацыяльныя супярэчнасьці ў грамадзянстве, розныя ўскладненьні ў галіне міжнароднай палітыкі—вось пункты, якія могуць заважыць на выбарах, тым больш, што новай афэры пакшталт «ліста Зіноўева» выдумліваць ужо ня прыдзецца.

Апошнія выбары ў мясцовыя рады Англіі далі ўжо вельмі значны ўзрост галасоў рабочай партыі пры адначасовых вялікіх стратах кансэрватараў. Ходзяць пагалоскі, што і ліберальная партыя мае значныя шансы на перамогу над кансэрватарамі там, дзе яны ў апошнія гады мелі забясьпечаныя мандаты.

Такім чынам, можна чакаць, што на надыходзячых у Англіі выбарах кансэрватары прайграюць кампанію, чым, магчыма, будзе паложан канец рэакцыйнаму курсу ангельскай палітыкі, а гэта адабьецца і на нашых стасунках з Англіяй.

* * *

У Францыі парлямант, выбраны 11 мая 1924 г., мае большасьць левых партый. Апошнія выбары адбываліся пад лёзунгам барацьбы з рурскай палітыкай Пуанкарэ, або з той палітыкай моцнай рукі, ініцыятарам якой быў Пуанкарэ, калі, будучы на чале ўраду народнага блёку, у студзені 1923 г. ён заняў Рурскую вобласьць. Францускі народ, змучаны толькі што скончанай вайной, аддаў тады свае галасы пераважна левым партыям. Аказалася аднак, што левая большасьць французскага парляманту, якая здолела зваліць Пуанкарэ і нават змусіць п. Мільерана пакінуць Элісейскі дварец, была разьбіта на шмат партый, што выклікала частыя зьмены ўрадаў (Эрыё, Пэнлевэ, ізноў Эрыё і г. д.) і не давала магчымасьці вясьці палітыку аднолькавага кірунку. А тут прысьпеў і канчатковы фінансавы крызіс, які пагражаў Францыі катастрофай. Левыя дробна-буржуазныя партыі не знайшлі нічога лепшага, як паклікаць таго-ж самага Пуанкарэ, якога скінулі ў 1924 годзе.

Выбары ў 1928 годзе адбудуцца, відаць, пад лёзунгамі змаганьня двух варожых адзін аднаму лягераў: пралетарскага пад галоўным кіраўніцтвам камуністычнай партыі, якая ў шмат якіх мясцовасьцях Францыі мае за сабою масы, і кансэрватыўна-буржуазным блёкам.

* * *

У Нямеччыне сучасная цэнтра-правая каліцыя навінна быць, як гіранічна выражаецца апазіцыя, адагнана ад «поўных жолабаў». Выбары у мае 1924 году (за тыдзень перад францускімі выбарамі) не далі пераважаючай большасьці ні правым, ці левым. Два гады нямецкі ўрад, абаперты на партыях цэнтру, лавіраваў ад выпадку да выпадку, запяўняючы сабе большасьць, то левую, то правую.

Толькі год таму назад нямецкія крайнія правыя парашылі ўступіць у ўрад і гэтым далі магчымасьць утварыць цэнтра-правую каліцыю. Саюз гэты ня ёсьць прыемны ні цэнтру, ні нацыяналістам, і канфлікты ўнутры ўраду становяцца ўсё часьцейшымі, асабліва калі трэба вырашыць якую небудзь справу ў галіне замежнай палітыкі.

У Нямеччыне пераконаны, што новыя выбары прынясуць нацыянальна-нямецкім і правым партыям наогул некарысныя вынікі.

Таму і партыі сучаснай каліцыі не сьпяшаюцца, як відаць з апошніх галасоў іх органаў прэсы, з новымі выбарамі, якія навінны прынесьці перамогу левых партый і значнае павялічэньне ліку камуністычнай фракцыі рэйхстагу.

* * *

Хоць выбары

Усебеларуская канфэрэнцыя літаратурнага аб'яднаньня „Маладняк"

Прамова тав. Сянькевіча.

Ад імя ЦК КП(б)Б канфэрэнцыю вітаў загадчык АПА ЦК тав. Сянькевіч.

— У той пэрыяд,—кажа прамоўца,—калі пытаньню культурнай рэвалюцыі надаюць вялікае значэньне, літаратура і мастацтва павінны заняць наважнае месца. У нас, у БССР, утварылася пралетарская літаратура пачынаючы з 1923 году.

Паогул, сучасная беларуская літаратура ёсьць дзіця рэвалюцыі, рэвалюцыі 1905 году, якая абудзіла працоўныя масы, якая фактычна дала пачатак разьвіцьцю сучаснай беларускай літаратуры, высунуўшы такіх волатаў, як Янка Купала і Якуб Колас.

Кастрычнікавая рэвалюцыя яшчэ ў большай меры, чымся рэвалюцыя 1905 году, адчыніла вялікія магчымасьці разьвіцьця беларускай літаратуры і мастацтва. Мы бачым, як з рабочых і сялян узрастаюць новыя літаратурныя сілы. Літаратурнае аб'яднаньне пралетарскіх пісьменьнікаў «Маладняк» узрасло на хвалях рэвалюцыі і адыграла вялікае значэньне ў гісторыі нашага культурнага жыцьця.

Зусім слушна, што партыя не магла прайсьці міма гэтага важнага пытаньня. Партыю не магло абыйсьці пытаньне, якім ідэалёгічным зьместам прасякнута пралетарская літаратура, бо яна зьяўляецца вялікім выхаваўчым фактарам.

«Маладняк» з самага пачатку адбіваў у сваіх творах працэс утварэньня беларускай дзяржаўнасьці, беларускай эканомікі, беларускай культуры.

Гэты шлях разьвіцьця ня мог застацца без барацьбы ў саным „Маладняку", яму прышлося весьці змаганьне за суцэльнасьць сваёй ідэалёгіі, за свае пралетарскія пазіцыі. Ад гэтай дыфэрэнцыяцыі «Маладняк» ня толькі не аслабеў, але ён яшчэ больш загартаваў сваю ідэалёгію

У далейшай працы перад «Маладняком» сталіць задачы,—захаваць шчыльную сувязь з рабочымі і сялянствам. Калі да гэтага часу „Маладняк" папаўняў свае шэрагі, галоўным чынам, моладзьдзю з вёскі, то зараз «Маладняк» павінен зьвярнуць сваю ўвагу на нашы фабрыкі і заводы, каб упягнуць у шэрагі «Маладняка» шырокія кадры рабочых ад варстату.

Трэба таксама, каб «Маладняк» больш шчыльна наладзіў сувязь з братэрскімі літаратурнымі арганізацыямі РСФСР, Украіны і інш. савецкіх рэспублік, каб з гэтай сувязі чэрпаць новыя сілы для сваёй творчасьці і навесьці нашу літаратуру на пралетарскія рэйкі.

Сучаснае становішча і пэрспэктывы далейшага разьвіцьця „Маладняка".

(З дакладу т. Галавача).

У апошнія часы літаратурнае аб'яднаньне «Маладняк» перажыло эпоху крызісу.

Арганізацыя «Маладняк» ад гэтага не памерла і не разбурылася, як аб гэтым гаварылася і нават пісалася ў цэнтральнай прэсе. Гэта арганізацыя нас пад сабою трывалы грунт для свайго далейшага разьвіцьця. Праўда, у апошні час ад «Маладняка» адкалолася яшчэ цэлы шэраг таварышоў, якія арганізавалі новае літаратурнае аб'яднаньне, але маладнякоўскі актыў яшчэ захаваўся.

Зараз «Маладняк» яднае 60 сяброў, якія ўваходзяць у акруговыя філіі. Апроч таго, існуюць маладнякоўскія студыі.

Далейшая задача «Маладняка»—пагыбленьне і высьвятленьне сваёй пралетарскай сутнасьці ў літаратуры. «Маладняк», як арганізацыя пралетарскіх пісьменьнікаў, павінна яднаць людзей з пэўным класавым напрамкам. «Маладняк» павінен заняцца выяўленьнем літаратурных сіл сярод рабочых. Адначасова «Маладняк» будзе прадаўжаць выяўленьне літаратурных талентаў і сярод сялянства.

У далейшым «Маладняк» павінен паставіць перад сабою задачу, падвышэньня якасьці сваёй творчасьці, пашырэньня выхаваўчай працы, узмацненьня марксысцкай крытыкі.

На гэтай канфэрэнцыі павінна быць пастаўлена пытаньне аб уваходзе «Маладняка» ва ўсесаюзнае аб'яднаньне пралетарскіх пісьменьнікаў.

Пасьля дакладу т. Галавача былі заслуханы інфармацыі кіраўнікоў акруговых філій.

Больш увагі загатоўцы экспортнае сыравіны

Загатоўка прадуктаў лёну праходзіць зусім слаба.

ТРЭБА ЖЫЦЬ УСЕ ЗАХАДЫ ДА ВЫКАНАНЬНЯ ВЫЗНАЧАНАЕ НОРМЫ

За „прыхільнасьць" да прыватніка—на год зьняволеньня.

Кіраўнік с.-г. калёніі «Рассвет», Клімовіч, ня гледзячы на абежнік НК Гандлю за № 9, якім было запрапанавана лішкі збожжа ды іншую сыравіну прадаваць дзяржаўным і кааперацыйным установам, прадаў прыватніку на суму 960 р. 08 к. жыта з дастаўкай на млын «Возрождение».

Менскі акруговы суд, разгледзіўшы гэту справу, прыгаварыў Клімовіча на год зьняволеньня.

Колькі загатовіла спажыв. кааперацыя за 10 дзён.

СЛУЦАК, 16-2. Нізавая сетка спажывецкай кааперацыі Случчыны за першыя 10 дзён лютага загатовіла 225 тон хлебных прадуктаў, 40 пуд. семя лёну і рознай экспортнай сыравіны на 14676 р. Зусім слаба стаіць справа з загатоўкай валакна лёну і скураной сыравіны: за 10 дзён гэтых прадуктаў нічога не загатоўлена.

МАГІЛЕЎ, 16-2. Спажывецкая кааперацыя Магілеўшчыны за першую дэкаду лютага загатовіла 81 тону хлебных культур, 2,9 тоны семя лёну, 1,6 тоны валакна-лёну, скураной сыравіны на 400 руб. і рознай экспортнай сыравіны на 5356 р. Як сьведчаць лічбы, зусім слаба справа з загатоўкай валакна-лёну і скураной сыравіны.

МАЗЫР, 16-2. За першыя 10 дзён лютага нізоўка спажывецкай кааперацыі нашай акругі загатовіла 240 пуд. семя лёну, на 9199 руб. мяса, каля 3000 пуд. розных хлебных прадуктаў, на 1757 руб. скураной сыравіны і на 4016 р. экспортнай сыравіны. Валакна лёну нічога не загатовілі.

ВІЦЕБСК, 16-2. Спажывецкая кааперацыя Віцебшчыны за 10 дзён загатовіла 98 тонн хлеба, 5 тон семя лёну, на 9418 р. мяса, скураной сыравіны на 5300 р. і рознай другараднай экспортнай сыравіны на 8273 р. Зусім кепска стаіць справа з загатоўкай лёну-валакна: у першую дэкаду лютага нічога не загатоўлена

ВОРША, 16-2. Па ўсёй Аршаншчыне праз спажывецкую кааперацыю ў першай дэкадзе лютага загатоўлена: 276 п. семя лёну, 900 пуд. валакна лёну і кудзелі, 9241 пуд. розных хлебных культур, на 4770 р. скураной і на 4946 руб. экспортнай сыравіны.

ГОМЕЛЬ, 16-2. Спажывецкая кааперацыя Гомельскай акругі за першыя 10 дзён лютага загатовіла 138 тон хлеба, 61 пуд. семя лёну і на 20373 руб. другараднай экспортнай сыравіны. Слаба ідзе праца па загатоўцы валакна лёну і скураной сыравіны.

ПОЛАЦАК, 16-2. За першую дэкаду бягучага месяца наша спажывецкая кааперацыя загатовіла мяса на 8321 р., скураной сыравіны на 4400 р., хлеба 46 тон, семя лёну толькі 2 тонны і экспортнай сыравіны на 4029 р.

МЕНШЧЫНА, 16-2. Спажывецкая кааперацыя Менскай акругі загатовіла 453 тоны розных хлебных культур, 1,3 тоны семя лёну, скураной сыравіны на 8631 р. і мяса на 15404 р. Апрача таго, загатоўлена рознай экспортнай сыравіны на 11911 руб.

„Улада на мясцох".

Старшыня Лагойскага РВК — чалавек вельмі сур'ёзны: ён жартаў ня любіць, нікога не прызнае, апроч сябе самога,—ён толькі прызнае „ўладу на мясцох", а „ўлада на мясцох"—ён сам.

Дырэктывы Наркамгандлю, Акрганду і іншых рэгулюючых органаў для яго—пустыя гукі; ён сам вядзе ўсю загатоўчую палітыку ў сваім Лагойскім раёне, і пры гэтым пае вядомы раманс: «Захочу—полюблю, захочу разлюблю»...

Адвойчы ён паклікаў да сябе карабейніка гр-на Файна, які вёў загатоўку (па дагавору) для Белдзяржгандлю і меў права, згодна растлумачэньня Наркамгандлю і Акрганду, на ўсім раёне загатаўляць рызьбэ, лекавыя расьліны, косьці і іншыя віды сыравіны,—пакліканы да сябе і запытаў пазажна:

— Ты хто такі?

— Я—карабейнік, Файн, вяду загатоўкі для дзяржаўнай арганізацыі ў Лагойскім раёне; вось, глядзіце, мой дагавор.

Старшыня Лагойскага РВК узяў з рук гр-на Файна дагавор, паглядзеў, памяў яго, прачытаў і сказаў:

— Ого, брат, здорова! Ты вядзеш загатоўкі на ўсім раёне, здорова!

— Як жа, тав. старшыня,—заявіў гр. Файн,—ладзен загад загатаўляць ва ўсю, трэба выканаць дагавор, бо інакш кепска будзе.

— Ну, гэтага ня будзе; я ве дазваляю так „распусьнічаць" на ўсім раёне. Скажыце, калі ласка, што за раскоша! Я, старшыня РВК, дазваляю весьці загатоўку толькі ў 2-х сельсаветах—Падонскім і Логальскім (Лагойскага раёну), і больш ані, чуеш?

— Ну, а дагавор,—пачаў баравіцца карабейнік Файн,—мяне прыцягнуць за невыкананьне...

Старшыня Лагойскага РВК, ня доўга думаючы, узяў дагавор і на ім напісаў уласнаю рукою:

„Дазваляю весьці загатоўку толькі ў двух мясцох", вось табе апраўдальны дакумант, а дагавор не перашкаджай працаваць...

Карабейнік Файн прыехаў у Менск і пытаецца, што яму рабіць: старшыня РВК больш не дазваляе працаваць.

Што рабіць? Мы думаем, што трэба спытацца ў пракуратуры, ці меў права „ўлада на мясцох" рабіць на дагаворах гэткія забараняючыя надпісы. Паслухаем, што пракуратура скажа. *А. Манін.*

ПРАМТАВАРЫ Ў ВЁСКУ.

Менскі акруговы інспэктарыят гандлю выдзеліў 50 швейных машын спецыяльна для ўзмацненьня загатовак лёну. Разам з тым для вясковай кааперацыі Меншчыны выдзелена 6 вагонаў бавоўнянай мануфактуры і на 10.000 руб. сукна і шарсьцянай тканіны. Гэткія прамтавары таксама накіроўваюцца ў лёнаводныя раёны акругі.

У САВЕЦЕ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР.

(Пасяджэньне 15 лютага г. г.).

На гэтым пасяджэньні разам з іншымі былі разгледжаны наступныя пытаньні:

АШЧАДНАЯ СПРАВА Ў БССР.

СНК выслухаў даклад Галоўнай Касы Ашчадносьці аб становішчы ашчаднай справы ў БССР. У дакладзе было адзначана, што сетка кас ашчадносьці ў 1926-27 г. павялічылася ў параўнаньні з 1925-26 г. на 25 кас. Лік іх складаецца з 468 кас, у тым ліку ў гарадох—136 кас і ў сельскіх мясцовасьцях—332 касы. Адна каса ашчадносьці ў БССР прыпадае на 238 квадр. вёрст, або на 10,7 тыс. жыхароў. Сетка кас ашчадносьці цяпер перавышае даваенную сетку на 44,4 проц.

З мэтаю ўзмацненьня кіраваньня ашчадпаю справаю мяркуецца пакінуць у кожнай акрузе адну акруговую цэнтральную касу, замест існуючых цяпер двух цэнтральных кас пры АКРФА і філіялах Дзяржбанку. З 1 сакавіка 1928 г. мяркуецца арганізаваць аддзяленьні цэнтральных кас пры акруговых канторах сувязі, а таксама адчыніць гарадзкія самастойныя аддзяленьні кас ашчадносьці ў асобных раёнах і некаторых акруговых цэнтрах. Прызнана мэтазгодным адчыніць у відзе вопыту самастойныя сельскія аддзяленьні ашчадных кас. У 1927-28 г. маецца на мэце адчыніць у БССР 2 сельскія аддзяленьні.

Астача ўкладаў у касах ашчадносьці на 1-X-27 г. выявілася ў суме 3.557.470 руб., прырост укладаў за 1926-27 г. склаў 1.773.470 р. або 95,2 проц. На тысячу жыхароў у БССР прыходзіцца 714 руб. укладаў, на 1 душу насельня—толькі 46 кап.

На 1-X-27 г. налічвалася 56.018 укладчыкаў, за год лік укладчыкаў павялічыўся на 82,8 проц. Па асноўных сацыяльных групах агульны лік укладчыкаў на 1-X-27 г. разьмяркоўваецца так: рахункаў рабочых—14,8 проц., укладаў—7 проц., служачых—48,6 проц. і 37 проц., сяляні—11,5 проц. і 4,6 проц., саматужнікаў—2,4 проц. і 2,4 проц. У параўнаньні з 1925-26 г. памянушася ўдзельная вага ўкладаў юрыдычных асоб і павялічыўся лік сялянскіх рахункаў. Агульны лік укладчыкаў сялян павялічыўся за год з 1240 да 5.886, у сярэднім на 1 сялянскую гаспадарку прыпадае 21 кап. укладу, на 1 раён у БССР прыпадае ў сярэднім 56 укладчыкаў сялян. Сярэдні ўклад на 1 укладчыка на 1-X-27 г. складае 63,5 руб. Удзельная вага БССР у сыстэме ашчадных кас БССР характарызуецца наступным: у адносінах ліку ашчадных кас на долю БССР прыпадае—3,2 пр., у адносінах укладчыкаў—2,5 проц., укладаў—2 проц. Тэмп росту асноўных паказчыкаў ашчаднай справы ў БССР за 1926-27 г. не азначае адставаньня ад СССР. Значна на прыліся за год перасоўныя і акрэдытыўныя апэрацыі кас (на 192,1 проц. і на 410,2 проц.). Кошт адной апэрацыі ашчадных кас складаў у 1925-26 г. 82 к., а ў 1926-27 г.—33 кап.

Выслухаўшы даклад аб становішчы ашчаднай справы ў БССР, СНК пастанавіў утварыць камісію для апрацоўкі рэзалюцыі па дакладу.

НАЗНАЧЭНЬНІ.

СНК пастанавіў назначыць пры Народным Камісары Земляробства БССР калегію ў наступным складзе: 1) Валодзька (Нам. Наркома), 2) Каровікаў (Нам. Наркома, 3) Ткачоў, 4) Шычко, 5) Аксючыц, 6) Вайтэнкаў, 7) Тамковіч, 8) Дубіна, 9) Сколіч, 10) Гарэцкі і 11) Тафеенка.

СНК таксама зацьвердзіў наступны склад Статыстычнай Плянавай Камісіі пры ЦСУ БССР: Прэфарансаў, Навядушка, Смусевіч, Шастакоў, Элькінд, Арцемчэў, Горын, Гальдштэйн, Вагер, Гілінаў, Сьвятлоўскі, Шэйвін, Арцымовіч і Гарэцкі.

ЗЬНЯЦЬЦЕ АБАВЯЗКАЎ.

СНК пастанавіў зьняць з тав. Шонгера П. М. абавязкі члена Вышэйшага Савету Народнай Гаспадаркі БССР.

Два гады лясная валакіта.

Трэба зьвярнуць увагу.

У 1925 годзе ў чэрвені месяцы лес якім зараз карыстаюцца вёскі Пачышча і Чартава, быў перададзен апошнім Іванаўскім лясьніцтвам у бестэрміновае карыстаньне.

Увесь 1925 год справа ішла вельмі добра: упаўнаважаныя ахоўвалі лес так, як гэтага вымагаў лясны кодэкс.

У 1926 г. в. Сасноўшчына, якая, між іншым, састаіць у аб'яднаньні лесу м. з. вёскай Старыя-Дарогі, пачала дамагацца таго, каб як-небудзь удзельці ў гэты лес карыстацелямі.

У 1927 г. у сакавіку м-цы, ня гледзячы на тое, што справа аб далучэньні вёскі Сасноўшчыны да лесу Пачышча і Чартавы ня вырашана, і што дзялянка ад агульнай плошчы лесу поўнасьцю ўжо была выкарыстана на 1926-27 г., сасноўцы з якойсьці на руках паперкай адвялі новую дзялянку і высеклі.

Карыстацелі гэтага лесу вёскі Пачышча і Чартава, ня ведаючы ў чым справа, пачалі дамагацца высьвятленьня яе, дзеля чаго справа была перададзена чэрвенскай пракуратуры, якая абядала справу вырашыць у тэрміновым парадку.

І вось праходзіць ужо больш як паўгода, а сяляне і да гэтага часу нічога аб гэтым не даведаліся.

Падышла восень. Упаўнаважаны в. Чартавы т. Кунцэвіч Сьц. бяз ведама астатніх упаўнаважаных і карыстацеляў гэтага лесу, дае дазвол сасноўцам на сухастой і павал, якія, падабраўшы ўсё дачыста і вывазіўшы без адбою ўсе дровы, пачалі па старых сьлядох валіць дубнак, ясеньнік і іншы каштоўны лесаматар'ял. На запытаньне аднаго з упаўнаважаных у сасноўцаў „Чаму вы без адбою возіце дровы», апошнія адказалі: «Нам дазволіў т. Кунцэвіч Сьц.

І так, правам ці ня правам, дровы в. Сасноўшчынай вывезены, а некаторыя карыстацелі гэтага лесу ня маюць зусім дроў, як Баравік І., які пачаў бурыць лазьню, каб абагрэць сябе. Калі часамі ўпаўнаважаны зьвяртаўся да Кунцэвіча, таксама ўпаўнаважанага, каб зрабіць вобыск у в. Сасноўшчына, куды павезены пасечаныя ясені, дык апошні адказаўся:

— Мне няма часу, трэба ехаць да фэльчара.

Вось якія адносіны Кунцэвіча да парубшчыкаў.

У сьнежні м-цы 1927 г. на прапанове с.-савету былі зроблены первазбары ўпаўнаважаных лесу м. з. в. в. Пачышча і Чартавы. Кунцэвіч Сьц. на перавыбары не зьявіўся і назаўтра, калі новыя ўпаўнаважаныя пайшлі за справамі, дык ён адмовіўся аддаць.

Праз некалькі дзён Чэрвенскі райземаддзел дае заказ Лядзенскаму і Горкаўскаму с.-с., каб апошнія зноў правялі перавыбары ўпаўнаважаных сумесна з в. Сасноўшчынай, бо апошнія без ліку былі няправільны (ці маюць права сасноўцы, калі справа аб далучэньні ня вырашана, удзельнічаць у перавыбарах).

У назначаны дзень перавыбараў карыстацелямі в. в. Пачышча і Чартавы была пададзена заява, у якой была просьба да с.-савету аддажыць перавыбары на дні 4, бо за вырашэньнем справы аб далучэньні Сасноўшчыны прадстаўнік паехаў у Менск. Усё-ж такі, ня гледзячы на гэта, Сасноўцы сталі дамагацца таго, каб перавыбары не адкладваць, а правесьці сёньня. Перавыбары правялі пры 23 чал. ад Сасноўшчыны і пры 1 ад Пачышча і Чартава.

І што-ж мы зараз бачым? Справы ўсе знаходзяцца ў Інспэктарыяце Лясоў БССР, упаўнаважаныя выбраны па загаду с-с. адны, на загаду Райземаддзелу другія, а лес застаўся без нагляду і нішчыцца, як ня трэба лепш, бо, вядома, без гаспадара нама каму заступіцца.

Вялікая просьба гр-н в.в. Чартавы і Пачышча да Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі ў тэрміновым парадку вырашыць справу аб лесе м. з. Чартавы і Пачышча, бо калі справа працягнецца яшчэ да вясны, дык ад лесу не застанецца і паміну. Адна надзея засталася толькі на РСІ.

Па даручэньню сялян С. З.

Горкі, Чэрвенскі раён.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ВЯСЕНЬНЯЙ СЯЎБЫ.

Крэдытаваньне сел. гаспадаркі

У другім квартале, згодна пляну Белсельбанку, адпушчана на крэдытаваньне сялянства ў часе вясеньняй пасяўной кампаніі: на набыцьцё сельскагаспадарчых машын—500000 руб., на штучнае ўгнаеньне—200000 руб., на разьвіцьцё травасеяньня—400000 руб., на насеньне лёну—100000 руб., на насеньне ярыны—100000 руб. і на рабочую жывёлу—200000 руб. Такім чынам сёлета адпушчана на крэдытаваньне сялянства 1500000 р. (летась 1100000 р.).

Апрача гэтага, для задаволеньня сезонных патрэб калектыўных гаспадарак у другім квартале адпушчана дадаткова 480000 руб. і спэцыяльна для крэдытаваньня вясковай беднаты—142000 р.

Белсельбанк даў дырэктывы аб прымяненьні зацьверджанай гэтымі днямі Эканомнарадам новай шкалы крэдытаваньня па машыназабясьпечаньні.

Новы парадак крэдытаваньня прадугледжвае цэлы шэраг шырокіх ільгот для калектыўных гаспадарак, машынных таварыстваў і вясковай беднаты.

Белсельбанк разам з зацікаўленымі ведамствамі распрацаваў праэкт крэдытаваньня насельніцтва насеньнем і штучным угнаеньнем. Гэты праэкт уносіцца на зацьверджаньне ў рэгулюючыя органы рэспублікі. Праэкт прадугледжвае крэдытаваньне ў вясеньнюю пасяўную кампанію выключна бядняцка-сераднякіх слаёў вёскі, прычым беднае будуць давацца ільготы як у часьці ўзносу задатачных сум, так і ў прадастаўленьні крэдыту на больш вялікі тэрмін.

Недахопы ў разьмеркаваньні крэдытаў, якія назіраліся ў мінулым годзе, узяты пад увагу, і на месцы дадзены дырэктывы крэдытаваньне заможнай часткі вёскі зусім не праводзіць.

У заключэньне неабходна сказаць, што палова крэдытаў ужо адпушчана акругам.

Другая палова крэдытаў будзе адпушчана месцам у сакавіку.

ПАДРЫХТОЎКА Ў МЕНШЧЫНЕ.

Да вясеньняга севу Менская акруга патрабуе: 4000 п. насеньня канюшыны, 5000 п. сэрадэлі, 17000 п. лубіну, 100000 п. звычайнага аўсу, 10000 пуд. сартавога аўсу, 5000 п. ячменю і 6000 п. семя лёну-даўгунцу. Асабліва дрэнна абстаіць справа з загатоўкаю аўсу і вікі. Акрэа робіць захады, каб забраніраваць увесь насенны авёс, які толькі ёсьць у савецкіх гаспадарках. Усе іншыя віды насеньня можна будзе загатовіць на ўнутраным рынку.

На пасяўную кампанію адпускаюцца кредыты ў суме 1869100 р., апроч таго, на набыцьцё коняў па лініі Белсельбанку асигнаваны доўгатэрміновы крэдыт у суме 451000 р.

Дрэнна абстаіць справа з ходам кантрактацыі. Банк да гэтага часу ня вызначыў яшчэ пэўных сродкаў і невядома, хто будзе праводзіць гэту кампанію. Акрэмаддзел вызначыў па пляну закантрактаваць насевы лёну на плянцы ў 500 дзес. у Халопеніцкім, Бярэзінскім, Бягомльскім, Барысаўскім і Сьмілавіцкім раёнах.

Старыя байцы, вэтэраны і гэрої Чырвонай арміі апавядаюць моладзі

ПРА ПАМЯТНЫЯ ЧАСЫ ВЯЛІКАЙ БАРАЦЬБЫ.

Хто за тое, каб ісьці ў бой?..

(Успаміны тав. Сердзіча).

Вецер калыхаў кавыль. Гэта стэпавая трава неяк падазрона хвалямі пераліваласа, як часам пад лёгкім вятрыскам хвалюецца і пераліваецца спелае жыта і шуміць... шуміць...

Безмэрным стэпавым прасторам, здавалася, няма канца. Падазронае хваляваньне і шум кавылю, наближэньне ночы і лёгкая перастрэлка недзе далёка-далёка стваралі нейкае жудаснае пачуцьцё ў байцоў.

Часьці апраўляліся ад цяжкага бою. На невялікую кучку нашых гэроеў, якая ўнарвалася ў далёкі тыл ворага, [illegible] што быў зроблен страшэнны [illegible]напад. Некалькі палкоў белай [illegible]ы і пяхоты, ведаючы, што ў [illegible]ць нязначная сіла чырвоных, [illegible] что накінулася на іх і хацела [illegible] усё, а чаго нельга зьнішчыць.

[illegible]ашны бой...

[illegible]чыльна зьляцеліся і... праз [illegible]паплыла рэчка крыві...

[illegible]астка нашых вагнала ад[illegible]я белыя банды, а рэшта тут [illegible] неравзвяжацца...

[illegible] гэтым белыя не супакояцца. [illegible]ны рыхтуюць нешта большае.

* * *

Вось вярнуліся і нашы часьці, якія [illegible]ганялі ворага.

Далей яны не маглі ісьці.

У некалькі сот раз большая колькасьць ворага была ім не пад сілу.

Ноч. Шум кавылю. Баявая задача. Тыл. Варожае акружэньне. Стогны параненых.

Што рабіць далей? Ісьці да сваіх? А баявая задача?..

— Галасуем...

— Хто за тое, каб ісьці ў бой?.. Большасьць.

Пайшлі. Націснулі. Не ваюецца. Адскочылі назад.

Як з зямлі вырас перад намі тав. Цімашэнка.

— Куды вы?! Назад! Большасьць пастанавіла ваяваць.

Сабраліся ў месца і рашылі:

— Апошнім націскам мы прыцягнулі ўвагу ворага да гэтага пункту. Ударым яму ў тыл, на мястэчка Райман. Пастаноўлена.

* * *

Некалькі гадзін сотні конскіх ног перабіралі кавыль.

Павозкі з кулямётамі паціху ляскталі. Пачало сьвітаць...

На небасхіле пачалі вырысоўвацца контуры мястэчка Райман.

І белыя палкі, і гарматы, і кулямёты спалі. Спала ўсё мястэчка Райман. Яшчэ некалькі крокаў. Яшчэ некалькі хвілін. Разьведка пачала страляніну з заставамі ворага...

Шпоры ўпіліся ў конскія бакі... Кавыль раптоўна зашумеў.

На ходу—некалькі выстралаў каля белых застаў. Праз пару хвілін некалькі выстралаў у Гаймане.

— Тав. камандзір, наш узвод 4 гарматы забраў!

— Добра. Даём іх сюды.

Едзе чырвонаармеец. Ён даносіць:

— Наш эскадрон 4 гарматы ў палон забраў.

— Даём іх сюды, будзе 8.

Дзесяткі кулямётаў, бранявыя машыны, тысячы белых былі захоплены сонными.

Некалькі кавалерыстаў за рукі вядуць чалавека ў споднім майтках. Адзін у руцэ цягне мундзір з генэральскімі пагонамі. З кішэні выняслі нейкую паперку, чыталі:

«... сьведчыцца, што паказчык гэтага—камандзір кавалерыйскай дывізіі генэрал Сярпухоў...»

Ініцыятыва 6 байцоў.

(Успаміны тав. Ланціонава).

Тры брыгады нашай пяхоты з невялікімі часткамі кавалерыі, 4 бранявыя цягнікі абаранялі Данбас.

Прывабны кавалак. Урангель ужо некалькі тыдняў ломіць галаву над тым, каб захапіць яго.

Ён пусьціў сюды 3 бранявыя цягнікі, выдзеліў свае лепшыя афіцэрскія палкі, паабяцаў ім высокія нагароды за ўзяцьце Данбасу.

Кожны дзень адну за другою мы адбівалі атакі Урангелеўцаў. Сотні забітых, дзесяткі соцен параненых.

На правым крыле белыя напалі на адзін з нашых палкоў і палову байцоў перабілі. Камандзір палка забіты...

З левага крыла наступаюць ня менш трывожныя весткі. Аднак, там нашы яшчэ трымаюцца.

Урангель рашыў нас намалу сьціскаць жалезным колам французкае зброі. Ён выбраў правільны шлях. Толькі працяжным сьцісканьнем ён мог пазбавіць нас сьвежага прытоку сіл, паралізаваць нашу баяздольнасьць і заняць Данбас—тое, абараняць што нам было строга загадана.

Куды кінуць рэзэрвовую брыгаду: направа, ці налева? Паслаць туды і сюды, значыць драбіць і без таго раздробленыя сілы.

Паслаць налева?... А чаму не направа?

Аднак, рабіць нешта трэба было, бо кола Урангеля ўсё сьціскалася і сьціскалася.

Направа...

Палкі перакаціліся праз некалькі бугроў і апынуліся каля чыгуначнай дарогі.

Едучы ззаду, можна было бачыць, як пяхота з калён у міг распыліласа. Некаторыя часьці залягі.

— Наўжо і тут урангелеўцы?.. Калі так—дрэнна. Палкі захоплены неспадзявана, залягуць і тады ўсё прапала. Урангелеўцы ня толькі Данбас захопяць, але дабіюць канчаткова правае крыло, а пасьля і левае.

Бяжыць чырвонаармеец...

— Таварыш камандзір, бранявы цягнік...

— Усё прапала,—мільгавула ў галаве.—Бранявіка стрэльбаю ня возьмеш. Усё зьнішчыць.

Справа прыняла такі нечаканны зварот, што патрэбна было ізноў думаць, каб на нешта рашыцца. А думкі ў галаву ня лезуць. Рэчы накіраваліся на ўзгорак, адкуль паказваецца дымок бранявіка, і адтуль не адрываюцца.

На гэтым баку ўзгорку паказалася некалькі чалавек. Яны перабягаюць...

— Варожая разьведка,—зарухалася ў галаве.—Дрэнна... Але... Што гэта? Яны залягі на абодвых бакох дарогі і страляюць у напрамку бранявога цягніка... Два чалавекі нешта робяць на чыгуначнай лініі... Раптам яны скаціліся пад адкос.

Што гэта?

Думкі заварушыліся роем. Пару хвілін і... на лініі страшэнны ўзрыў.

Хто-б гэта ні зрабіў, а раз рэйкі сагнутыя стаяць у павутры, значыць адягло...

Стала зусім лёгка. Часьці неяк бадзёра ўсхапіліся, перайшлі дарогу і шпарка пайшлі наперад.

Падыходзячы да правага крыла, мы заўважылі, што нас даганяюць 6 чалавек.

Гэта нашы гэрої-падрыўнікі, якія сваёю адвагаю і ініцыятывай выратавалі ўсе нашы часьці, Данбас і далі магчымасьць канчаткова раскалашмаціць ворага.

З гэтага моманту урангелеўскія банды пайшлі на поўдзень.

Пайшлі і больш не вярнуліся.

Цені мінулых дзён.

(Успаміны ўдзельніка барацьбы з бандытызмам).

Пасьля барацьбы з балахоўцамі наш полк атрымаў загад: «перайсьці ў Чэрвенскі павет, мястэчка Лапічы, для барацьбы з бандытамі, якія да гэтага часу ўжо абрабавалі Пухавічы, разьбілі склады ў Градзянцы, спалілі воласькь у Нагарэлым.

Толькі полк увайшоў у мястэчка, як прышла дэлегацыя з м. Сяліба з просьбай дапамагчы ім у ахове мястэчка ад бандытаў.

Праз некалькі дзён у адным фальварку, дзякуючы дапамозе батрака, атрад злавіў 4 бандытаў, узброеных абрэзамі і наганамі.

Камандзір атраду, яшчэ добра ня ведаўшы пра сувязь бандытаў з мясцовымі кулакамі, загадаў: даць бандытам 6 канваіраў і адправіць іх у штаб палка.

Але па шляху, у лесе канваіры былі злоўлены, з іх зьнялі абмоткі і абмоткамі іх задушылі. Толькі на 3 дзень знайшлі іх разьведчыкі.

Гэта нас навучыла асьцярожасьці. А па палку быў дадзен загад: «Сувязь з атрадамі і штабам падтрымліваць камандамі ня меней 15 чалавек».

Палку стала ясна, што бандыты тут добра замацаваліся і без дапамогі насельніцтва з імі нічога ня зробіш. Склікалі нараду, на якой вырашылі трымаць цесную сувязь з мясцовымі партыйцамі, а ў волаські назначыць сваіх прадстаўнікоў.

Праз тыдзень у штабе атрымалі паперку бяз подпісу: «Бандыты пайшлі на вясельле ў в. К.».

Зараз-жа туды накіравалі атрад. Пачатак зроблен. 5 бандытаў злоўлена. Яны паказалі нам, што з бандытамі весьці барацьбу вельмі цяжка, бо ў іх маецца сувязь з шмат якімі ўстановамі.

Сярод бандытаў было 2 браты. Першым сталі дапытваць аднаго з іх, але ніводнага слова ад яго не дачакаліся.

Камандзір палка, параіўшыся з камісарам, аддаў загад растраляць першага брата. Праз 15 хвілін загад выкананы на вачох астатніх бандытаў.

Камандзір упэўніў другога брата ў тым, што яго жыцьцё залежыць ад таго, як ён дапаможа нашай барацьбе.

Бандыт пачаў пасьля гэтага сваё апавяданьне, якое цягнулася каля 2 гадзін. Бандыты чакалі в Польшчы Паўлоўскага, Жылінскага (які быў вайсковым камісарам у Чэрвені) і іншых. У бандытаў маецца два паграбы ў лесе, куды яны хаваюцца. Сувязь з жыхарамі наладжана добра, асабліва в вёскай Зафранцуская Грэбля. Вось галоўнае з паказаньняў.

З бандыты адпраўлены ў баявы вучастак, а гэты застаўся з намі.

Ноччу полк арганізуе палёт на логава бандытаў.

Ціха лесам ідуць байцы. Вось, па паказаньню бандыта, скора і логава. Вінтоўка ў руках моцна сьціснута. Логава ахоплена. Кола з чыр-цаў становіцца ўсё вужэй і вужэй.

Раптам сьвіст... Праваднік з бандытаў кажа: «Гэта сыгнал дазорнага!» Усе кінуліся к логаву. Але там і быў толькі адзін.

Праваднік крычыць: «За мною».

Кінуліся далей. Не прабеглі і кілометра як напалі на другое логава. Але сыгнал бандыта даў магчымасьць усім уцячы.

Зайшлі ў логава. Чаго там толькі ня было,—вінтоўкі, рэвальвэры, грошы, лістоўкі, бабскія кофтачкі і г. д. Логава мае два аддзяленьні: адно, вялікае памяшканьне, для бандытаў, а другое меншае, дзе часта начаваў палкоўнік Паўлоўскі з сваімі каханкамі.

Але і адзін, якога затрымалі, дапамог у нашай барацьбе. Ён расказаў, а кім трымаюць сувязь, хто дапамагае бандытам і як яны вядуць барацьбу з чыр-цамі. Часта за атрадам ідзе атрад бандытаў. У лесе на краёх сядзяць на дрэвах бандыты—наглядацелі.

Па паказаньнях бандытаў і другіх матар'ялаў у некалькіх кулакоў канфіскавалі маемасьць.

На гэта бандыты адказалі тым, што ў аднэй вёсцы павесілі трох сялян, а ў другой павесілі пастуха, які не хацеў аддаць ім карову.

Пасьля гэтага здарэньня сялянства стала больш актыўна нам дапамагаць і ў штабе палка можна было часта сустрэць барадача ў ланцёх, які прышоў казаць дзе ён бачыў бандытаў.

Адзін за другім бандыты сталі нападаць к нам.

Аднойчы прыбягае селянін і ў дзьвярах крычыць: «Бандытам есьці павялелі».

Фурманка з мясам, хлебам, самагонам злоўлена. Праз 15 хвілін 22 бандыты ў нашых руках, сярод іх капітан.

Фурманка з правізіяй з Зафранц. Грэблі.

На другі дзень пастанова: «Зафранцускую Грэблю за дапамогу бандытам выселіць у Архангельскую губэрнію».

База бандытызму зьнішчана.

У барацьбе чырвоных байцоў з бандытамі дапамаглі самі сяляне. Бо армія і працоўныя ідуць ма аднаму шляху, на якім ворагі капалі канавы і не давалі магчымасьці рабоча-сялянскаму ўраду адбудоўваць зьнішчаную гаспадарку.

Канавы засыпаны, мы ідём за гладкай дарогай да будучых перамог.

С. Н.

„Коратка, ясна і зразумела“...

(Заўвагі па справаздачнасьці МЦРК).

Нядаўна праўленьне МЦРК рабіла справаздачу аб сваёй дзейнасьці за 1926-27 апрацыйны год перад пайшчыкамі, сябрамі саюзу Працасьветы, згуртаванымі ў групком № 2 і МК школы № 2.

Справа адбылася ў памяшканьні школы № 2.

Групком і МК налічваюць разам звыш 300 сяброў саюзу і з гэтага ліку пайшчыкаў па групкому каля 156 асоб, а па МК каля 40 асоб.

Здавалася-б, што да такога вялікага прафгуртаваньня праўленьне МЦРК аднясецца ўважліва і прыйме на справаздачу сталага дакладчыка, з якім можна будзе пагаварыць па справах нашае каапэрацыі належным чынам, тым больш, што гэтае пытаньне ў пачатку каапэрацыйнай справаздачнасьці садымалася і абгаварвалася ў мясцовай прэсе.

Але чамусьці праўленьне МЦРК заўсёды абыходзіць рабпросаўскія сходы і па прыкладу мінулых гадоў прысылае на справаздачу асоб, мала вядомых пайшчыку, а значэ менш маючых адносіны да непасрэднага кіраўніцтва справамі нашае каапэрацыі.

Каля 8 гадзіны вечара на сход прышоў рабіць справаздачу аб працы Менскага Цэнтральнага Рабочага Каапэратыву супрацоўнік Ленінградскага жыртрэсту т. Р-у, які супрацоўнікам ЦРК быў гадоў 4 таму назад.

Убачыўшы замест прадстаўніка тае арганізацыі, якая рабіць справаздачу, прадстаўніка іншае арганізацыі, прысутныя на сходзе апусьцілі рукі.

Прышоўшы рабіць справаздачу, тав. Р-у сказаў, што сёньня ён ужо прышоў на трэцюю справаздачу і што яму патрэбна пабываць на чацьвертай, чаму прасіў сход хоча не затрымліваць, каб даць магчымасьць справіцца.

Сход пагодзіў да гэтага пытаньня фармальна і вызначыў тэрмін на даклад 20 хвілін, тым больш, што ў абвестцы дню стояла яшчэ справаздача бюро касы ўзаемадапамогі, выбары новага бюро і равкамісіі, абгаварэньне каллогавару, заключанага паміж Акрна і ЦП саюзу Працасьветы і інш. Адным словам, як кажуць, багатаму сам чорт дзеці хрысьціць, так і нашаму праўленьню МЦРК.

Дакладчык быў нагатоўлі акуратным, што вызначанага тэрміну на справаздачу яму хапіла з гакам. Даклад ён зрабіў „коратка, ясна і зразумела“, чаму на скарчэньні яго нават у тых, хто зьбіраўся нагаварыць аб-сім тым з каапэрацыйнага жыцьця, не павярнуўся язык.

Пад вялікім націскам з боку прэзыдыуму разам з старшынёй сходу выказаліся ўслед чатыры асобы і было зададзена каля 10 запытаньняў.

На запытаньне старшыні сходу, якія будуць прапановы па справаздачы МЦРК, сход дружна і гучна адказаў—прыняць да ведама.

Прышлося ўмяшацца ў гэтую справу, каб даказаць сходу, што справа каапэрацыі тут ні прычым, а недарэчнасьці дапушчаюцца кіраўнікамі гэтае справы, што справа каапэрацыі—вялікая справа, дзе поруч з шэрагам недахопаў ёсьць і дасягненьні, на што сход павінен у рэзалюцыі зьвярнуць належную ўвагу.

Толькі пасьля зробленых заўваг была абрана камісія дзеля апрацоўкі рэзалюцыі, якая адногалосна была прынята сходам у канцы пасяджэньня.

Мне здаецца, што праўленьню МЦРК патрэбна было-б больш уважліва, а не фармальна адносіцца да справаздачы.

І. Масюкевіч.

Бібліяграфія.

Праф. ЗАМОЦІН І. „Мастацкая літаратура ў школьным выкладаньні“ (мэтадычныя нарысы). Вып. І БДВ, Менск. 1927. Стар. 125+3 нар. ц. 1 р. 20 к. Тыраж 3000.

Кніга зьяўляецца І-м выпускам мэтадычных нарысаў (усіх будзе—два!) і прысьвячаецца пытаньням літаратурнае асьветы ў асноўных прынцыпах і мэтадычных прыёмах выкладаньня настаўнікам літаратуры.

Зьмест кнігі мае пяць наступных разьдзелаў: 1) Задача літаратурнае асьветы ў працоўнай школе, 2) Матар'ял выкладаньня літаратуры і яго праграмнае групаваньне, 3) Асноўныя прынцыпы мэтодыкі выкладаньня літаратуры. Педагагічнасьць выкладаньня. 4) Асноўныя прынцыпы мэтодыкі выкладаньня літаратуры. Навукагодносьць выкладаньня і 5) Агульныя мэтадычныя прыёмы школьнага выкладаньня літаратуры:—літаратура ў лекцыйнай сыстэме, у комплексе і ў лябараторным плане.

Кожны разьдзел мае дадатковую мэтадычную схему (таблічку), а ў канцы кнігі паеціца (не саўсім поўны, але досыць шырокі) бібліяграфічны каталіг — паразьдзельна. Шостая схема зьяўляецца дадаткам, як лябараторнае заданьне па распрацоўцы літаратурнага матар'ялу—у агуле.

Нарысы карыстаюцца мэтадычным матар'ялам расейскае літаратуры, але пераважна прысвасованы да літаратуры беларускай з плянавым разьлікам да курсу 7-мі і 9-ці гад. школ.

Пачынаючы з крытычнага высьвятленьня мэтадычных праграмм літаратурнае асьветы ў расейскай дарэвалюцыйнай школе XIX і XX-га стагодзьдзя, аўтар галоўным чынам затрымліваецца на выяўленьні сучасна-пануючых у літ-ры мэтадаў, якія і аналізуе падрабязговым разглядам. Гэтакім чынам падагульваючы вынікі і дасягненьні мэтодыкі дарэвалюцыйнае школы аўтар будуе формулу школьнае літаратурнае асьветы з 4-х наступных момантаў: а) разьвіцьцё літаратурнае мовы, б) літаратурная начытанасьць (вучэньне), в) навукагоднае высьвятленьне літаратурнага матар'ялу з мастацкага і ідэалёгічнага бакоў і г) літаратурна-творчая самадзейнасьць вучняў у навуковым і мастацкім кірунку. Прымаючы пад увагу тое, што 3 і 4 артыкул формулы (в і г) у практыцы дарэвалюцыйнай школы арыентаваўся на індывідуалізацыю выхаваньня вучня, а цяперашняя школа патрабуе працоўнага прынцыпу—як непасрэдней сувязі вучня з жыцьцём шырокіх працоўных мас—аўтар імкнецца падмесьці з мэтадаў тыя, якія больш адказваюць жыцьцёвым запатрабаваньням.

Якімі-ж мэтадамі трэба карыстацца, каб выканаць вышэйказаную формулу ў працоўным прынцыпе?

Як эклектык аўтар трымаецца найбольш распаўсюджанага сацыялёгічна-марксыцкага мэтаду (сацыялёгічны—у яго марксысцкім удаскальненьні) і фармальна-мастацкага, які ў сваю чаргу зьязвяецца з сацыялёгічным. Да гэтага яшчэ далучаецца мэтад псыха-аналітычны (тлумачэньне псыхічнага аблічча мастака і яго гэроў на сэксуальнай тэорыі З. Фрэйда). Цікава толькі, чаму ў рубрыцы тлумачэньня мэтадаў—мэтад маркысцкі не разглядаецца самастойна, а зьяўляецца як-бы ўдакладненьнем сацыялёгічнага мэтаду і гэткім чынам зьліваецца ў адно цэлае ў той час, як сэксуальная дактрына Фрэйда—(фундамант і тлумачэньне якой досыць адносны, а ў практыцы літаратурных досьледаў выяўлены выпадкова)—ужо канцэ як мэтад. А што належыць да тэорыі Фрэйда, дык не наогул трэба лічыць аднабокай (і з іскатарага боку!) нават-асацыяльнай.

І досьледы, падобныя да псыханалізу праф. Ермакова (асабліва разгляд твораў Гогаля), могуць толькі зьбіць з панталыку і напкодзіць сур'ёзнай працы маладых досьледчыкаў.

Падрагоў, трохі незразумела, чаму ў прыстасаваньні да марксыцкага мэтаду аўтар пераважна рэіць карыстацца досьледамі Львоў-Рагачэўскага ў той час, як мы маем (хоць і маладога!), але больш вытрыманага і тэарэтычна моцнага досьледчыка-марксыста Г. Гарбачова.

Але, у агуле трэба зазначыць, што кніга (ня гледзячы на яе схематычнасьць—канспэкт унівэрсітэцкіх лекцыяў—БДУ і публічных дакладаў) надта цікавая і надзвычайна патрэбная, як мэтадычны падручнік, які паможа беларускаму студэнцтву і настаўніцтву прыстасаваць новым мэтады літаратурнае асьветы для практычнага ўжываньня.

Чакаем другога выпуску, які будзе ілюстраваць тэарэтычныя асновы першай кніжкі ўзорамі жывых прыкладаў з мастацкае літаратуры.

Пераклад з аўтарскага рукапісу (расейскае мовы) на беларускую мову зроблен В. Г. Мачульскім, і за выключэньнем выпадковых русыцызмаў вызначаецца лёгкасьцю і зразумеласьцю. Зубр.

КІНО.

„Конец Санкт-Петербурга“.

Другая фільма таленавітага рэжысэра Вс. Пудоўкіна „Конец Санкт-Петербурга“—вялікі мастацкі твор. Адным невялікім недахватам гэтай фільмы трэба лічыць расцягнутасьць сюжэту.

Фільма надзвычайна ўдала пачата тэмаю старой расейскай вёскі. «Пензенскія, наўгародзкія, цьвярскія»... голі, васковая бедната, цяжкая праца за сахою і ўся страва—кусок чорнага хлеба...

Гэты кароценькі ўступ створан з вялікаю сілаю, мастацкай яскравасьцю і прастатой.

Ва ўсёй фільме, аднак, суцэльнасьці не адчуваецца: у ёй ня выйшла барацьба вялізарных сіл, на выйшла рэвалюцыя, якая тут павінна быць паказана яскрава.

Глядзіш гэтыя сумныя малюнкі шэрай вёскі, простыя, але надзвычайна моцныя малюнкі экспляататыі рабочых, эпізоды крывавай бойні, галодных жанчых у чарзе, крыўяньне Керанскага і адчуваем, што ўсё гэта толькі эпізоды. Пасьля іх мохавічнага злучэньня гэтых адрыўкі не даюць належнага ўражаньня аб вялізарнай барацьбе, якую краіна і рабочая кляса перажылі ў тыя дні.

Аднак, гэты фільм вялікі крок наперад.

Пудоўкін, змагаючыся з традыцыямі прымітыўнага і шаблённага сюжэту, стварыў нешта новае. Трэба толькі дамагацца, каб гэта новая, арыгінальная „кіно-мова“ была зразумелай.

С. Аз.

НОВЫЯ КНІГІ.

Выйшлі з друку і паступілі ў рэдакцыю газ. «Савецкая Беларусь» для рэцэнзіі наступныя кніжкі выданьня Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва:

1. „Варка“ дзіцячая казка Л. Чарняўскай—цана 55 кап.
2. „Полымя“ беларуская часопісь літаратуры, палітыкі, эканомікі, гісторыі № 1—цана 1 р. 50 к.
3. „Вестник иностранной литературы“ выданьне Дзярж. Выд. РСФСР № 1, цана 1 руб.

Хроніка.

У прэзыдыуме ВСНГБ.

Новы дырэктар лёнапраднага аб'яднаньня.

Прэзыдыум ВСНГБ назначыў замест Мар'ясіна дырэктарам лёнапраднага аб'яднаньня тав. Камаева—б. намесьніка дырэктара Мэталётрэсту.

«Дняпроўская мануфактура»—дзяржаўнае прадпрыёмства.

З 15 лютага Дубровенская фабрыка „Дняпроўская мануфактура“ перайшла ў веданьне ВСНГБ на правах самастойнай гаспадарчай адзінкі. Да гэтага часу яна была ў веданьні працалектыву.

Бюро швэйнай прамысловасьці.

У зьвязку з пашырэньнем швэйнай прамысловасьці ў БССР (арганізацыя новай ф-кі ў Гомелі, новая ф-ка ў Менску, пашырэньне віцебскай і інш.), пры ВСНГБ арганізавана бюро швэйнай прамысловасьці. Старшынёю гэтага бюро назначэна тав. Тэклін—б. старшыня ЦП саюзу швэйнікаў.

Намесьнік Інжэнэра Асінастрою.

Намесьнікам галоўнага інжэнэра Асінастрою тав. Алейнікава прэзыдыум ВСНГБ назначыў тав. Шаршнёва—б. намесьніка старшыні Гомельскага АВК.

17.000.000 р. на дарожнае будаўніцтва.

У бягучым годзе будзе разгорнута вялікая праца па дарожным бунаўніцтве. Згодна пляну, на дарожнае будаўніцтва па БССР будзе адпушчана каля 17.000.000 руб. (на 32 проц. больш, чым у мінулым годзе).

Сельска-гаспадарчыя навіны.

Курсы для пасялкоўцаў.

У хуткім часе ў межах Менскай акругі адчыняюцца 2-хмесячныя курсы ў асяродках пасёлачнага будаўніцтва Пухавіцкага, Барысаўскага і Койданаўскага райёнаў для падрыхтоўкі пасёлкавага актыву. Праз гэтыя курсы будзе прапушчана ў 3-х райёнах звыш 100 чалавек. Па бюджэту на кожныя курсы асыгнавана па 500 руб.

Нарада зямельных працаўнікоў.

20-га лютага ў Менску адбудзецца нарада акруговых зямельных і лясных працаўнікоў. Нарада мае абмеркаваць пытаньні падыходзячай насяўной кампаніі, становішча с.-г. каапэрацыі, савецкіх гаспадарак і інш.

У працах нарады мае прыняць удзел каля 120 чалавек.

Арганізацыя пункту штучнага аплоджваньня кабыл.

У Койданаве пры ветэрынарнай лячэбніцы сёлета арганізуецца пункт для штучнага аплоджваньня кабыл. Дзеля гэтага ў Койданаў будзе пасланы з дзяржаўнай стайні рысак густога тыпу.

Штучнае аплоджваньне будзе весьціся з 15-га сакавіка да 1-га чэрвеня.

Заместа 60 матак пры гэтай сыстэме будзе магчымасьць аплодзіць да 1000 матак.

Да сьвяткаваньня Міжнароднага Жаночага Дню.

Да часу сьвяткаваньня Міжнароднага Жаночага Дню (8-га сакавіка) Нар. Кам. Асьветы БССР прыстасоўвае адчыненьне курсаў для падрыхтоўкі працаўных працаўнікоў, якія будуць працаваць у вясковых дзіцячых пляцоўках. Апроч гэтага, пры клюбах будуць арганізаваны куткі па пытаньнях дашкольнага выхаваньня

Усебеларуская санітарная нарада.

Учора, 16-га лютага, адчынілася ўсебеларуская нарада санітарных дактароў. Нарада разгледзіць цэлы шэраг пытаньняў, зьвязаных з санітарным аздараўленьнем вёскі і гораду. У нарадзе прымаюць удзел усе акруговыя санітарныя дактары. Нарада працягнецца 3 дні.

4.000 руб. на арганізацыю вясковых дзіцячых пляцовак.

ЦК Дапамогі Дзецям адпусьціў 4.000 руб. на арганізацыю летніх дзіцячых пляцовак. Апошнія будуць арганізаваны ў вёсках для дзяцей незаможных гаспадароў і ў савецкіх гаспадарках для дзяцей батрачак.

Абсталяваньне для запалкавых фабрык.

Беларускі запалкавы трэст зрабіў заказ у Нямеччыне праз Управу Дзяржгандлю БССР на партыю машын для выпрацоўкі фанэры на запалкавых фабрыках „Возуві“, «Дняпро» і „Чырвоная Бярэзіна“. З устаноўкай машын павялічыцца выпуск прадукцыі фанэры, а таксама будзе зьніжан сабекошт яе.

65 вагонаў баваўняных тавараў для БССР.

Нар. Кам. Гандлю СССР выдзяліў для завозу ў працягу лютага 65 вагонаў баваўняных тавараў.

ЯК ПАСТУПАЮЦЬ ПАЯВЫЯ ЎЗНОСЫ.

У працягу студзеня рабочая каапэрацыя БССР сабрала паявых узносаў 50.166 руб., а за першыя 10 дзён лютага сабрана па 14 пэрабкоках 24.337 руб.

Уводзіцца сацыяльнае страхаваньне батракоў.

Галоўная Ўправа Сацыяльнага Страхаваньня БССР у бліжэйшы час праводзіць у жыцьцё закон ЦВК і СНК СССР аб сацыяльным страхаваньні батракоў. Зараз распрацоўваецца супольна з саюзам працаўнікоў зямлі і лесу падрабязная інструкцыя для ажыцьцяўленьня гэтага мерапрыёмства.

Машыны для апрацоўкі с.-г. прадуктаў.

На днях з Нямеччыны праз Управу Дзяржгандлю БССР атрымана для Белсельсаюзу партыя машын для апрацоўкі сельска-гаспадарчых прадуктаў, пераважна для апрацоўкі ягад. Гэтыя машыны пойдуць для свабжэньня сельска-гаспадарчых калектываў і арцеляў.

Збор сродкаў на танк «Фэлікс Дзяржынскі».

На набудову танку імя Фэлікса Дзяржынскага па БССР сабрана сярод польскага насельніцтва 2.750 руб. Кампанія па збору сродкаў па БССР ужо закончана.

Здарэньні.

САМАГУБСТВА.

У эвакуа-прыёмніку на Ракаўскай вул. № 16 павесіўся невядомы мужчына. Асоба яго высьвятляецца.

ПАМЁР СЕЛЯНІН БАРАНАЎ.

У Цэнтральным Доме Селяніна неспадзявана захварэў селянін з вёскі Крулкі (Аршаншчына) Бараноў. Пры адвазеньні яго ў больніцу, на дарозе Бараноў памёр.

ЗАТРЫМАН РЭЦЫДЫВІСТ ЖУРАЎСКІ.

Крым. Вышук затрымаў злодзея-рэцыдывіста Жураўскага, які ў апошні час зрабіў шэраг буйных крадзяжоў.

ТРУПІК ДЗІЦЯЦІ.

На могілках у Койданаве знойдзен трупік забітага дзіцяці мужчынскага полу.

КАНАКРАД.

У апошні час у Барысаве ўчасьцілася пакражы селянскіх коней з рынку. Канакрад Федасееў, які рабіў гэтыя пакражы, затрыманы.

ШТО СЛУХАЦЬ ПА РАДЫЁ.

Пятніца, 17-II.

6-00—6-30 Гутарка 4-я на прыродазнаўству на тэму: «Пахаджэньне совечнай сыстэмы».
6-30—7-10 Беларуская радыё-газэта № 30.
7-10—7-40 Гутарка агранома: 1) ачыстка збожжа, 2) вырашчваньне лёнаў.
7-40—8-10 „Беларуская Вёска“ па радыё.
8-10—10 Канцэрт.

Субота 18-II.

6-00—6-30 Гутарка з веруючымі і неверуючымі з цыклю: «Кніга быцьця».
6-30—7-10 Беларуская радыё-газэта № 31.
7-10—7-40 Гутарка 8-я з цыклю „Да 10 гадавіны Чырвонай арміі на тэму: „Савецкая грамадзянскасьць і абарона СССР».
7-40—8-10 Гутарка ЦК ЛКСМБ на тэму: „Задача вясковых камсамольцаў у сувязі з рашэньнямі 15 парт. зьезду УсеКП(б) аб калектывізацыі с.-г.
8-10—10 Канцэрт.

СУД.

„Начальства“ пагаварылася.

Амаль год грам. вёскі Крывасёлкі, Капыльскага раёну, Юлька Клыга судзілася з сваім суседам Сілівеем Клыгай за кавалак гароду.

Сілівей Клыга моў вельмі ўпарты характар. Судзячыся за гарод, ён падаваў скаргі ў розныя ўстановы і на кожным кроку пагражаў Юльцы:

— Пачакай, пачакай! Гэта не апошні суд: каня і апошнюю карову прадам, але дакажу, што гарод мой.

Аднак, колькі Сілівей Клыга ні судзіўся, праўда пераважыла крыўду, і гарод застаўся за Юлькай Клыга. Атрымаўшы выканаўчы ліст на прысуджаны гарод, Юлька Клыга зьвярнулася да старшыні Крывасельскага с.-сав. Пятруся Лабанка, каб ён выканаў рашэньне суда і адмеру ён гарод ад Сілівея Клыга.

— Добра, ідзі дамоў і чакай—заўтра раніцой я і сэкратар будзем на месцы і там адвядзём прысуджаны гарод,—заявіў старшыня.

Раніцой каля хаты Юлькі сабралася шмат сялян. Усе чакалі старшыню, каб пагаварыць наконт насеньня і па іншых справах.

Хутка да натоўпу падкацілі старшыня Лабанок з сэкратаром Тамашом Барысам і накіраваліся адводзіць гарод Юльцы Клыга.

Добра не разгледзіўшы сталай мяжы, Барыс і Лабанок захапілі, адводзячы гарод Юльцы, частку гароду Андрэя Клыга, які пачаў спрачацца з старшынёй і сэкратаром.

У часе спрачак сэкратар нанёс набої Андрэю Клыга, а старшыня Лабанок схапіў лапатку і пачасаў ёю плечы старога Андрэя.

Выязная Сэсія Менскага Акруговага Суду, разглядзеўшы гэту справу, прыгаварыла Лабанка на тры гады і 6 месяцаў зьняволеньня, а Тамаша Барыса—на тры гады зьняволеньня. Дастасаваўшы да асуджаных амністыю ў адзнаку 10 гадавіны Кастрычнікавае рэвалюцыі, Суд скараціў ім кару—Лабанку напалову, а Барысу—на адну трэць.

Д. Кастроў.

20.000 руб. на рамонт кватэр у савхозах Менсельпрому.

Менсельпром адпусьціў 20.000 руб. на рамонт кватэр рабочых у сваіх савецкіх гаспадарках. Рамонт распачнецца з першымі цёплымі днямі.

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР.

ПАСТАНОВА

Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

пра адзначэньне дзесяцігодзьдзя існаваньня Рабоча-Сялянскае Чырвонае арміі.

Для адзначэньня дзесяцігодзьдзя існаваньня Рабоча-Сялянскае Чырвонае арміі Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

1. Даручыць Народнаму Камісарыяту Працы не позьней 23-га лютага гэтага году ліквідаваць беспрацоўе начальніцкага складу запасу Рабоча-Сялянскае Чырвонае арміі.

2. Даручыць органам камунальнае гаспадаркі выдзеліць для начальніцкага складу Рабоча-Сялянскае Чырвонае арміі ў залежнасьці ад колькасьці войска ў данай мясцовасьці да 10 проц. жылое плошчы ў дамох, якія цяпер будуюцца, і ў тых, якія капітальна здрамантаваны ці аднаўляюцца.

3. Даручыць акруговым выканаўчым камітэтам пры разьмеркаваньні сярод працоўнага насельніцтва дзяржаўнае зямельнае маемасьці (зямлі, сенажаць, садоў, агародаў) у першую чаргу надзяліць інвалідаў Рабоча-Сялянскае Чырвонае арміі—удзельнікаў грамадзянскай вайны.

4. Даручыць Народнаму Камісарыяту Сацыяльнага Забясьпечаньня зрабіць усе захады для забясьпечаньня ў бліжэйшы час магчыма большага ліку інвалідаў Рабоча-Сялянскае Чырвонае арміі пратэзамі.

5. Даручыць Народнаму Камісарыяту Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі і акруговым выканаўчым камітэтам не позьней 23-га лютага гэтага году канчаць праверку ажыцьцяўленьня законаў пра льготы для вайскоўцаў Рабоча-Сялянскае Чырвонае арміі і іх сем'яў і паведаміць аб выніках праверкі Савет Народных Камісараў.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Чарвякоў.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Сэкратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. Хацкевіч.

16 лютага 1928 г.
г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров БССР

об ознаменовании десятилетия существования Рабоче-Крестьянской Красной армии.

В ознаменование десятилетия существования Рабоче-Крестьянской Красной армии Центральный Исполнительный Комитет и Совет Народных Комиссаров БССР постановляет:

1. Поручить Народному Комиссариату Труда не позже 23-го февраля текущего года ликвидировать безработицу начальствующего состава запаса Рабоче-Крестьянской Красной армии.

2. Поручить органам коммунального хозяйства выделить для начальствующего состава Рабоче-Крестьянской Красной армии, в зависимости от количества войска в данной местности, до 10 проц. жилой площади в домах вновь возводимых, капитально отремонтированных и освобождающихся.

3. Поручить окружным исполнительным комитетам при распределении среди трудового населения государственного земельного имущества (земли, сенокосов, садов, огородов) в первую очередь наделять инвалидов Рабоче-Крестьянской Красной армии—участников гражданской войны.

4. Поручить Народному Комиссариату Социального Обеспечения принять все меры к обеспечению в ближайшее время возможно большего числа инвалидов Рабоче-Крестьянской Красной армии протезами.

5. Поручить Народному Комиссариату Рабоче-Крестьянской Инспекции и окружным исполнительным комитетам не позже 23-го февраля текущего года кончить проверку проведения в жизнь законов о льготах для военно-служащих Рабоче-Крестьянской Армии и их семей и сообщить о результатах проверки в Совет Народных Комиссаров.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Черваков

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР А. Хацкевич.

16 февраля 1928 г.

Апавяшчэньні.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— У пятніцу, 17-II, кіно „Зарэ“. Сэансы ў 7 і 9 час. Пасьля кожнага сэансу выступленьне артыстыкі—бытавых і жанравых песьні.

— 18 лютага а 6 гадз. веч. у Дом Працасьветы адбудзецца агульны сход сяброў касы ўзаемадапамогі пры 5 МК.

Парадак дня: 1. Справаздача бюро касы і 2. выбары бюро.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА

Менскага Гарадзкога Савету

№ 14. 10-га лютага 1928 г.

АБ ПАРАДКУ ЗАНЯТКАЎ ІЗВОЗНЫМ ПРОМЫСЛАМ.

Менскі Гарадзкі Савет пастанаўляе:

1. Устанавіць наступныя абавязковыя месцы стаянкі на адным баку вуліцы для легкавых і грузавых звозчыкаў:

1. На рагу Камсамольскай і Рэвалюцыйнай—легкавых,
2. » Рэвалюцыйнай і Рэспубліканскай—легкавых,
3. » Нямігскай і Нямга-Ракаўскай—грузавых,
4. » Савецкай і вул. Валадарскага—легкавых,
5. » Рэвалюцыйнай і Камсамольскай—грузавых,
6. » Савецкай і Пралетарскай—легкавых
7. » Савецкай і Шпітальнай — »
8. » Камунальнай і Семінарскага зав.—легкавых і грузавых,
9. » Камунальнай і Старажоўскай—легкавых,
10. » Сьвярдлоўскай і Ленінградскай—легкавых,
11. » Рэспубліканскай і пл. 25 Кастрычніка—легкавых,
12. » Савецкай і Сьвярдлоўскай—легкавых
13. » Камсамольскай і Савецкай »
14. » Савецкай і вул. Энгельса »
15. » Ленінскай і Універсытэцкай »
16. » Ленінскай і Савецкай »
17. » вул. Энгельса і Кастрычнікавай—легкавых,
18. » „ Талстога і Маскоўскай—грузав.
19. Ля ст. Менск—Заходняй чыгункі—легкавых.
20. На Бабруйскай вул. ля складу—грузавых.
21. Ля ст. Менск—МБД чыгункі—легкавых.
22. Ля Койданаўскага тракту—грузавых.
23. На Пляцу Волі—легкавых.
24. На Савецкай вул. ля чыгуначн. царквы—легкавых.
25. На пляцу ля 3-й савецкай лазьні—грузавых.

Увага: Фурманам устаноў, арганізацый і прыватных асоб дазваляецца чакаць сваіх пасажыраў ля пад'езду на месцы астаноўкі апошніх.

II. Ізвозны промысел лічыцца:

1. Легкавым—для перавозкі па гораду пасажыраў і нязначнага па вазе і ўпакоўцы багажу, і
2. Грузавым—для перавозкі грузаў.
3. Займацца ізвозным промыслам могуць толькі асобы, не маладзей 18 год.
4. Асобы, якія жадаюць займацца ізвозным промыслам, павінны ўзяць дазвол ад Адміністрацыйнага Аддзелу, прадставіўшы апошняму: а) спраўку Міліцыі і Крымінальнага Вышуку аб неабмежаваньні ў правох па суду; б) дакумант на права пражываньня і в) весткі аб колькасьці экіпажаў і коняй.
5. На права заняткаў ізвозным промыслам Адміністрацыйны Аддзел выдае адпаведнае пасьведчаньне і нумаровы знак.

Увага: Пасьведчаньні і нумаровы знак выдаюцца пасьля аплаты ў Акрфа ўстаноўленага за заняткі ізвозным промыслам збору і ня могуць быць перададзены іншым асобам, без дазволу Адміністрацыйнага Аддзелу. Пасьля спыненьня заняткаў ізвозным промыслам пасьведчаньне і нумаровы знак зварочваюцца ў Адміністрацыйны Аддзел.

6. Знакі прымацоўваюцца ў наступным парадку:

На легкавых экіпажах:

а) адзін значок вялікага разьмеру з буйнымі лічбамі прымацоўваецца ззаду экіпажу;

б) другі гэткага-ж разьмеру на левым баку козлаў экіпажу;

в) трэці, малога разьмеру, павінен знаходзіцца ў звозчыка ўвесь час працы.

На грузавых фурманках:

а) адзін, вялікага разьмеру з буйнымі лічбамі, прымацоўваецца да дугі сьпераду на відным месцы, і

б) значок меншых разьмераў павінен знаходзіцца ў звозчыка ўвесь час працы.

7. Легкавыя звозчыкі павінны мець ліхтары вялікім шклом з надпісам на ім чырвонай фарбай нумару, выдадзенага Адміністрацыйным Аддзелам. Ліхтары прымацоўваюцца з абодвых бакоў экіпажу ля козлаў і запальваюцца ў часе язды. Запальваць ліхтары ў часе стаянкі не абавязкова.

8. Асобам, якія займаюцца легкавым і грузавым ізвозным промыслам, забараняецца выяжджаць на заняткі у нецьвярозым відзе.

9. Легкавы звозчык павінен выяжджаць на працу толькі ў моцным і ахайным экіпажы, са здаровым канём.

10. Агляд экіпажу адбываецца камісіяй з прадстаўнікоў Камгасу, Міліцыі і Самаатуднення Грамадзтвазу ня менш чым 2 разы ў год.

Увага: Час агляду экіпажу адзначаецца пляміабай на нумары экіпажу. Звозчыкам, у якіх пасьля агляду экіпажы акажуцца непасаванымі, забараняецца езьдзіць па гораду, пакуль яны ня будуць прыведзены ў парадак, і выдадзеныя нумары ад іх адбіраюцца.

11. Звозчыкі абавязаны па запатрабаваньні работнікаў Міліцыі і Крымінальнага Вышуку адказіць у вызначаныя імі месцы грамадзян. За кожны такі выпадак звозчык атрымоўвае ад работнікаў Міліцыі ці Крымінальнага Вышуку квітак на выплату з касы міліцыі 30 кап.

12. Рэчы, забытыя пасажырам, звозчык павінен зараз-жа адвезьці ў бліжэйшае аддзяленьне міліцыі.

13. У часе язды звозчыкі абавязаны: а) трымацца правага боку, не дапускаючы праезду некалькіх экіпажаў падрад.

б) езьдзіць асьцярожна, папярэджваючы крыкам пранжджаючых і праходзячых;

в) у часе выседу з двара, на рагох і скрыжаваньнях вуліц езьдзіць толькі шагам;

г) не абганяць аўтабусу ў месцах астановак;

д) спыняцца ў часе праходу войска, маніфэстацый, партый арыштаваных і працэсій, пакуль яны ня пройдуць;

е) прытрымлівацца паказаньня чырвонага кійка вартавога міліцыянэра, узьняцьце якога азначае, што шлях закрыты;

ж) не вазіць больш 4-х дарослых пасажыраў.

Увага: 1. Грузавым звозчыкам дазваляецца езьдзіць толькі павольна і забараняецца правозіць груз па вуліцах: Савецкай ад рогу Нова-Маскоўскай да рогу зав. Луначарскага і па Ленінскай ад пляцу Волі да вул. К. Маркса.

2. Правілы, прадугледжаныя § 13, абавязковы ня толькі для звозчыкаў, але і для фурманоў устаноў і прыватных асоб.

3. Грузавыя звозчыкі па выгрузцы пустых грузаў павінны чысьціць вазы.

14. Звозчыкам забараняецца пераганяць адзін другога ў часе падачы экіпажу жадаючым. Калі звозчыка клічуць з некаторай адлегласьці ад месца стаянкі, павінен пад'яжджаць чарговы, які заўсёды павінен знаходзіцца на козлах экіпажу.

15. Камгасу распрацаваць інструкцыю экіпажаў звозчыкаў (для новых), абвясьціць ведама да 1 сакавіка 1928 г. і агледзіць іх згодна п. 10 гэтай пастановы.

16. Нагляд за выкананьнем гэтай пастановы даецца на міліцыю.

17. Вінаватыя ў парушэньні гэтай пастановы караюцца штрафам у адміністрацыйным парадку да 100 руб. ці прымусовымі работамі да аднаго месяца.

18. Гэтая пастанова набывае моц праз 7 дзён з дня яе абвяшчэньня.

Старшыня Менскага Гарадзкога Савету ЯЦКЕВІЧ.

Сэкратар Гарсавету ПАСЫНКОЎСКІ.

Рознае.

СТАРАДАЎНЯЯ ГЕОГРАФІЧНЫЯ КАРТЫ.

У Кітаі знойдзены язьве старадаўныя географічныя карты IX. або X стагодзьдзя. Выбіты яны на тоўстых каменных плітах, якія ляжаць паміж дзьвёх дадатковых пліт, адыгрываючых ролю футарала. Гэтыя карты зьяўляюцца копіямі паасобных частак падрабязнай і аграмаднай карты ўсяго Кітаю, якая складзена на пекалькі сот гадоў раней і якая не дайшла да нашых дзён.

НАЙВЯЛІКШАЯ Ў СЬВЕЦЕ ЭЛЕКТРЫЧНАЯ ЛЯМПА.

У Амэрыцы зрабілі для адной магутнай радыёстанцыі электрычную лямпу ў 100 кілёват. Яна мае 2 мэтры ў вышыню і важыць 50 кілёграмаў. Гэта лямпа замяняе на радыёстанцыі 5 лямп па 20 кілёват.

ГРУЗА-ПАСАЖЫРСКІ АЎТАМАБІЛЬ.

У Францыі сканструіраван вельмі выгодны аўтамабіль, які па жаданьню можна пераробіць у лёгкую, або грузавую машыну. Каб пасажырскі аўтамабіль пераробіць у грузавы, трэба ўсяго толькі зьняць сядзеньне і паадчыняць бакі кузава. На гэта патрэбна ня больш 5 хвілін часу.

„ЗЯЛЕЗНАЕ ДРЭВА“.

На Далёкім Усходзе, у паўднёва-заходняй частцы Прымор'я к захаду ад Амурскай затокі знойдзена незвычайна цьвёрдае дрэва. Гэта дрэва мацней за наш дуб у 3 з паловай разы і цэніцца вельмі дорага. Куля нагана ад «зялезнага дрэва» адскаквае. Колькасьць магчымага экспорту гэтай выключна моцнай драўніцы вылічана ў 150.000 кубічных футаў.

ПРАДАЕЦЦА ЗРЫЎ-ПАПЕРА І СТАРЫЯ ГАЗЭТЫ.
ДАВЕДАЦЦА Ў КАНТОРЫ ГАЗ. «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ» (РОГ ВУЛІЦ — КАРЛА МАРКСА І ЛЕНІНСКАЙ).

Чарговая лекцыя у Нядзельным Камвузе.

У нядзелю, 19 лютага, а 11 гадзіне раніцы ў вялікай залі клюбу імя К. Маркса

АДБУДЗЕЦЦА чарговая лекцыя ў Нядзельным Камвузе

па тэму: „Камуністычная партыя і нацыянальнае пытаньне на Беларусі“.

ЛЕКТАР т. ІГНАТОЎСКІ.

ЛІТАРАТУРА ДА ЛЕКЦЫІ: мінімум: 1) Сталін. „К постановке нац. вопроса“. У кніжцы „Нац. вопрос і РКП(б)“. Выд. АПА Белбюро ЦК РКП. Менск. 1924 г. стар. 2. 2) «Тезисы докладов на XI с'езде КП(б)Б». Выд. газ. «Зьвязда», стар. 25. 3) Журнал „Савецкае будаўніцтва БССР“ 1927 г. № 10. Два арт